Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаны рукапісы назад яўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашырэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашырэлі пасярок тэксту 1 р. — к. За радок пашырэлі поруч тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя ня 50 проц. даражэй. Зьніж тэрміну бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 25 мал. За кожны дадатковы 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Белгрускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 173 (2662) Чацьвер, 1-га жніўня 1929 г.

54кр. "Савецкая Беларусь" ОДЕССА, Пастера, 13 Дзярж. Публічн. бібліят. студз. сьнежань адз+н экз.

СЁНЬНЯ МІЖНАРОДНЫ ЧЫРВОНЫ ДЗЕНЬ.

1-ае жніўня—дзень мабілізацыі рэвалюцыйных сіл сусьветнага пралетарыяту супроць новай імпэрыялістычнай вайны, супроць буржуазеі і яе прыслужнікаў—сацыял-дэмакратаў.

Індустрыялізацыя нашай краіны, калектывізацыя савецкай вёскі—шлях умацаваньня абароназдольнасьці СССР.

УСЕ НА БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ, УСЕ НА АБАРОНУ СССР!

Да рабочых, чырвонаармейцаў і працоўнага насельніцтва БССР.

Таварышы!

Не пасьпела яшчэ чалавецтва залячыць тыя раны, што нанесла яму імпэрыялістычная вайна, як імпэрыялісты ўсяго сьвету зараз зноў пачалі рыхтавацца да новай яшчэ ячучванай бойні. Шалёным тэмпам растуць узбраеньні ва ўсіх капіталістычных краінах, мабілізуюцца ўсе сілы, каб зноў, як 15 год таму назад, крывавая здань вайны ахінула сьвет, прынёсшы зьнішчэньне мільёнам працоўных, зьнішчэньне створаных потам і крывёй працоўных каштоўнасьцяў.

Зараз вайна ў першую чаргу рыхтуецца супроць адзінай у сьвеце краіны пралетарскай дыктатуры—СССР.

Буйныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, індустрыялізацыя краіны, пры вялікім творчым энтузіязьме працоўных, не даюць сусьветнаму імпэрыялізму зрабіць з Краіны Саветаў рынку для сваіх тавараў і капіталаў. Наадварот, гатыя посьпехі яшчэ болей узмацняюць СССР, базу сусьветнай рэвалюцыі, як бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету. Дзеля гэтага сусьветны капіталізм, робячы правакацыйныя выпады, як напад на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы і інш., мабілізуюць усе сілы, вядзе шалёную падрыхтоўку да нападу на СССР. Ніякія размовы капіталістаў аб разброеньні ня зьнішчаюць гэтай небясьпекі новай вайны.

Вайна і вайна ў першую чаргу супроць Савецкага Саюзу ставіцца ў парадак дню.

Міжнародны сацыял-фашызм са ўсёй адданасьцю, са ўсёй шчырасьцю дапамагае сусьветнай буржуазіі ў гэтай справе. Рукамі сацыял-фашысцкага ўраду Мюллера ў Нямеччыне, „рабочага" ўраду Макданальда ў Англіі і ўсяго сусьветнага сацыял-фашызму вядзе імпэрыялізм агідную справу падрыхтоўкі нападу на СССР.

Разам з гэтым на грунце няўстойлівай гнілой стабілізацыі расьце хваля новых рэвалюцыйных боек. Узмацняецца фронт сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, мацнеюць сілы пралетарыяту, шчыльней аб'яднаюцца працоўныя наваколо камуністычнай партыі і штабу сусьветнай рэвалюцыі—Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Першамайская дэманстрацыя ў Бэрліне, стачкі ў Лодзі, барацьба тэкстыльшчыкаў у Бамбеі пацьвярджаюць гэта. Пралетарыят усяго сьвету выступае ў контр-атаку супроць імпэрыялізму.

У Міжнародны Чырвоны Дзень мільёны пралетарыяў пад штандарамі камуністычных партый выйдуць на вуліцы дэманстраваць сваю моц, сваю волю да абароны адзінай бацькаўшчыны працоўных—СССР. Мільёны пралетарыяў будуць рабіць агляд баявых пралетарскіх сіл для рашучага наступленьня на капіталізм.

Таварышы! Будуючы сацыялізм, дэманструючы адзіна шчырае жаданьне да міру, працоўныя Савецкага Саюзу ні на хвіліну не павінны забываць небясьпекі новага нападу на СССР, яшчэ больш узмацняць абарону яго.

Шчыльной шэрагі навокал камуністычнай партыі. Больш увагі да ўзброенай сілы пралетарыяту—Чырвонай арміі!

Таварышы! Дэманструючы сёньня сваю волю да змаганьня з новай навалай імпэрыялістычнай вайны, яшчэ больш упарта, яшчэ больш старанна будзем будаваць нашу сацыялістычную гаспадарку, замацоўваць і пашыраць мэтад нашае працы — сацыялістычнае спаборніцтва, адказваючы на наглы наступ імпэрыялістаў падпіскай на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. Рашуча павядзем наступленьне на прыватна-капіталістычны элемэнт. Узмацнім інтэрнацыянальную сувязь з працоўнымі ўсяго сьвету.

Таварышы! Дэманструючы супроць новай імпэрыялістычнай бойні, не забудзем мільёнаў барацьбітоў за справу пралетарскай рэвалюцыі. Не забудзем нашых братоў рабочых і сялян Заходняй Беларусі і Польшчы, што гібеюць у турмах польскага фашызму. Пашлём ім брацкае прывітаньне.

Таварышы! Усе на дэманстрацыю супроць новай імпэрыялістычнай вайны, супроць нападу на Савецкі Саюз!

НЯХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ!

ПРЭЧ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ І ІХ ПАСЛУГАЧОЎ—САЦЫЯЛ-ФАШЫСТАЎ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНЫ ПРАЛЕТАРЫЯТ!

ПРЭЧ ВАЙНУ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНУЮ—НЯХАЙ ЖЫВЕ ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА!

НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ БРАТЫ НАШЫ—РАБОЧЫЯ І СЯЛЯНЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І ПОЛЬШЧЫ!

НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ КАМУНІСТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ ЎСЯГО СЬВЕТУ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — ШТАБ СУСЬВЕТНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (бальш.) БЕЛАРУСІ.

РЫГОР ПАПАРАЦЬ.

ВАЙНА—ВАЙНЕ.

Таварышы мае,
па думках і ідэі,
Крыві працоўнае—
разьліты акіян...
Каб затушыць вялікія надзеі,
Чытаюць нам
і талмуд і каран.
Таварышы мае,
па думках і ідэі—
Ідэя моцная—
узросьціць флянс...
Шчэ на палёх крыжы
не парадзелі,
А сёньня новыя
рыхтуюцца
для нас.
Мы людзі новыя,
З душой сталёвай,
Расьпяць свой край не адда-
дзім—
Мы варту выставім
У моры бліскавіц
І ў бойку пойдзем як адзін.
Хай груганы зьлятаюцца
І кружацца ў паветры...
Надыдзе час!..
І нам паклоняцца
Віхуры, шквалы й ветры.
У дні гарматныя,
Жыцьцём расплатныя
Вышэй узьнімецца Чырвоны
Сьцяг
І на пажарышчы
Ўзмацнім палаючы
Вялікага Кастрычніку
працяг.
Таварышы мае,
па думках
і ідэі—
Ідэя моцная—
узросьціць флянс...
Шчэ на палёх крыжы
не парадзелі,
А сёньня новыя
рыхтуюцца
для нас.
Моцна абураны
вёска
і горад—
Плякаты на плоце,
плякат у вакне;
„Бойку рыхтуе сёньня нам
вораг"
Вайною-ж
адкажам
вайне.

31-VII-29 г.

КАНТРАСТЫ.

... Вэрсальская ўмова падлічыла прыблізныя страты ад імпэрыялістычнай вайны: 10 мільёнаў забітых, 15 мільёнаў памёршых ад ран, і на 20 мільёнаў менш нараджэньняў, чым у звычайны час. Вайна абыйшлася ў 600 міліярдаў залатых р., што складае больш паловы нацыянальнага багацьця ўсіх дзяржаў, якія прымалі ўдзел у вайне. Імпэрыялісты ўсіх краін хочуць паўтарыць 4-е жніўня 1914 году. Яны хочуць золата, ярыві. Але стыхія не падпачальваецца чалавечым законам. Стыхія не прызнае крэйсэраў Амэрыкі і самалётаў Францыі. У стыхіі свае законы, свае шляхі. Стыхія—рэвалюцыя, стыхія—мільёны працоўных зямной кулі.

... „Ня так даўно,—піша з Вены І. Рот,—адна газэт („Дэр Абэнд") надрукавала сьніс тых месцаў у Вене, дзе фашысты пад кіраўніцтвам дзяржаўных армейскіх афіцэраў вучыліся страляць з кулямётаў. Гэта навучаньне адбывалася ў глыбокіх глухіх сутарэньнях для таго, каб ня чутна была страляніна. Пасьля зьмяшчэньня сьпісу, паліцыя, якая добра знаходзіць у рабочых нават маленькі рэвальвэр, ня «здолела» знайсьці кулямётаў фашыстаў. Сацыял-дэмакраты, кіраўнікі паліцыі, не захацелі сварыцца з фашыстамі і папярэдзілі фашыстаў аб палёце паліцыі"...

... Вакханалія ўзброеньняў капіталістычных дзяржаў дасягнула найвышэйшай меры. Калі ў СССР вайсковых выдаткаў на душу насельніцтва прыходзіцца толькі 2,5 даляра, то ў Ангельшчыне—11,5 даляра, у Францыі—8,7 дал., у Італіі—6,3 дал. І разам з гэтым „матросы параходу „Фальке" адмовіўся перавозіць транспарт для Чан-Кай-Шы ў Шанхай, пакінулі арганізаваны параход. Капітан параходу хацеў набраць новых матросаў у Данцыгу, але яны ўсюды заяўлялі, што падтрымліваюць пралетарскую салідарнасьць з СССР і ніколі ня будуць дапамагаць узбройвацца заклятаму ворагу Савецкага Саюзу». Капітан сядзеў у каюце, кідаў за вакно—у чорную ноч папяросу за папяросаю і шукаў выхаду. Выхад быў знойдзен: навербавалі польскіх матросаў..., якія прадаюць самі сябе, клясу сваю і рэвалюцыю рабочую.

Але якую вагу маюць трэскі штрэйкбрэхэраў на хвялях салідарнасьці рабочых?

... «Пленум Падгойскага с.-с. ад 28-га ліпеня г. г. абгаварыў пытаньне аб правядзеньні Міжнароднага Чырвонага Дню і індустрыялізацыі краіны. Для ўзмацненьня фонду індустрыялізацыі, ўзмацненьня саюзу рабочае клясы з працоўным сялянствам і каб паказаць сусьветнаму капіталізму, што працоўнае сялянства СССР цьвёрда стаіць на варце аховы Кастрычнікавых заваёў—бяцкаўшчыны пралетарыяту—СССР, пастанавіў: усім сябрам сельскага савету ўнесьці ў фонд індустрыялізацыі краіны ня менш аднаго пуда хлеба бясплатна, здачу якога зрабіць 15-га верасьня г. г., а таксама падрыхтаваць да гэтага часу ўсё сялянства сельскага савету, каб не засталося ні аднаго двара, які-б ня здаў пуд хлеба ў фонд індустрыялізацыі краіны".

... І яшчэ: «Мы, камсамольцы баўманскага вайсковага атраду ў часе збору ў Лефортаве па дэманстрацыі сваёй падрыхтаванасьці да барацьбы з пагрозай імпэрыялістычнай вайны прэсім „Камсамольскую Правду" залічыць нас у батальён яе імя. Мы просім таксама РВС СССР кінуць наш батальён на фронт пры першых стрэлах на савецкай граніцы. Права на гэтае мы абяцаем заваяваць у першай бойцы».

Кантрасты штурхаюць адзін другі. Клясы разьмясьціліся на двух супроцьлеглых канцавосьсях. Сярэднія фарбы зьмяняюць свой твар, адыходзяць да тых або іншых кантрастаў, да той або іншай клясы. Клясавыя абвастрэньні нагнетаюцца, клічуць да новых боек. Не да боек, што распачаліся ў 1914 годзе,—абвастрэньні клічуць да канчатковай клясавай вайны, да сацыяльнай рэвалюцыі.

... Пралетарыят падрыхтаваны. Вайне—вайна! Шалёнай вакханаліі ўзбраеньняў—стыхія рэвалюцыі!

Цім. Зарэчны.

НАША ЧЫРВОНАЕ СЬВЯТА.

Успомнім мінулае. Успомнім тыя праклятыя дні, калі стрэл, якім быў забіты кронпрынц аўстрыйскай дзяржавы Франц-Фэрдынанд у Сараеве, паслужыў сыгналам да пачатку чатырохгадовага масавага забойства людзей.

Справа была ня толькі ў забойстве сэрбскім гімназістам Прынцыпам вайсковага аўстрыйскага саноўніка і яго жонкі.

Не з-за гэтага выбухнула крывавая імпэрыялістычная вайна, якая каштавала сьвету дзесяць мілёнаў маладых чалавечых ахвяр, каля 25 мілёнаў параненых і пакалечаных, якая каштавала ўсім дзяржавам 59 міліярдаў залатых даваенных рублёў.

За што-ж, у імя чаго загінулі гэтыя мілёны рабочых і сялян, у імя чаго ў працягу чатырох гадоў крывавай бойні руйнаваліся, зьнішчаліся гарады і вёскі?

У імя цывілізацыі. У імя гуманнасьці. За лепшую будучыню чалавецтва,—будуць фальшыва пісаць у гэтыя дні пятнаццацігодзьдзя з дню сусьветнай бойні буржуазныя газэты ўсяго сьвету.

Але абманутць сусьветны пралетарыят зараз ужо цяжка. Мы ведаем добра, хто вінават у гэтай чатырохгадовай крывавай бойні.

Мы ведаем добра, што вінавайцы крывавай імпэрыялістычнай вайны 1914-18 г. г.—капіталісты: расейскія, ангельскія, францускія, нямецкія, паўночна-амэрыканскія.

Барацьба за сусьветныя рынкі, за сусьветную гегемонію, за новыя землі і новыя калёніі,—вось сапраўдная прычына імпэрыялістычнай вайны, вось за што мілёны працоўных склалі свае галовы на палёх крывавых боек.

* * *

З датай пачатку крывавай імпэрыялістычнай вайны зьвязана і вялізарнае здрадніцтва сацыял-дэмакратыі II Інтэрнацыяналу.

5-та жніўня сацыял-дэмакратычная фракцыя нямецкага рэйхстагу галасавала за ваенныя крэдыты.

І з гэтага дню II Інтэрнацыянал, як рэвалюцыйная рабочая арганізацыя, спыніў сваё існаваньне.

Ня лепш нямецкіх трымалі сябе ў часе вайны і іншыя дзячы II Інтэрнацыяналу. Яны ўступалі ў буржуазныя міністэрствы, яны заклікалі працоўных да абароны „сваёй" буржуазеі, «сваёй» бацькаўшчыны. Яны прадавалі і абманвалі пралетарыят.

І толькі маленькая купка людзей—сапраўдных рэвалюцыянэраў сярод усеагульнага здрадніцтва і жахаў не здалі сваіх баявых пазіцый.

Гэта камуністычныя правадыры—старая, загартаваная ў баёх бальшавіцкая гвардыя, якая і зараз стаіць на чале рэвалюцыйнага руху і вядзе сусьветны пралетарыят на барыкады клясавай бойкі, да сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

30 ліпеня, за тыдзень да пачатку сусьветнай бойні, францускія рэакцыянэры забілі ў Парыжы францускага сацыяліста Жана Жорэса. Яны забілі яго дзеля таго, што ён быў проці імпэрыялістычнай вайны.

Гэта была ня першая і не апошняя ахвяра сусьветнай рэакцыі. Потым загінулі ад рукі гэтых-жа наёмных забойцаў Карл Лібкнэхт, Роза Люксэмбург, Вароўскі і шмат іншых гэроў-рэвалюцыянэраў...

* * *

У буры грамядзянскай вайны нарадзілася першая ў сьвеце рэспубліка працоўных—Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Ужо хутка 12 год, як рабочая кляса СССР настойліва будуе сацыялізм, будуе, ня гледзячы на ўсе цяжкасьці, новую, нябачаную яшчэ нідзе форму чалавечых адносін.

Мы ня хочам вайны, мы жадаем міру, жадаем магчымасьці працягваць будаваць сацыялізм у нашай краіне.

Але ня так разважае, не аб тым марыць сусьветная буржуазея. Яе задачы—зьнішчыць Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, яе мара—зьнішчэньнем рэспублікі працы загасіць той маяк, які сваім полымям паказвае пралетарыям усіх краін праўдзівы шлях да перамогі над капіталам.

Буржуазея рыхтуецца да новай сусьветнай бойні.

Чорныя хмары, якія спусьціліся на Далёкім Усходзе, грозна гавораць нам, што наш вораг ня сьпіць.

* * *

Сёньня, наша Чырвонае сьвята, сьвята таму, што пралетарыі ўсіх краін прадэманструюць сваю непарушную волю абараняць са зброяй у руках СССР.

Сёньня ўсюды—у Парыжы, у Лёндане, у Бэрліне, на поўначы і на поўдні, на ўсходзе і на захадзе, у далёкіх калёніях,—усюды, дзе ёсьць пакута, усюды, дзе б'ецца рэвалюцыйная думка — пралетарыят з чырвонымі штандарамі выйдзе на вуліцу, каб грозна крыкнуць сваім прыгнятацелям:

— Рукі прэч ад СССР! Рукі прэч ад нашай сапраўднай, адзінай пралетарскай рэспублікі!

І мы—працоўныя Савецкага Саюзу, выйдзем таксама сёньня на вуліцы нашых гарадоў і вёсак.

Мы выйдзем дзеля таго, каб перад усім сьветам прадэманстраваць нашу імкненьне да мірнай працы, нашу цьвёрдую волю давесьці, ня гледзячы на ўсе перашкоды, будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне да пераможнага канца.

Н. Беліна-Падгаецкі.

Усясьветны Чырвоны Дзень.

Пятнаццатая гадавіна сусьветнай вайны выпала на пэрыяд, калі пытаньне аб няўхільнасьці новай сусьветнай вайны паўстала цэнтральнай праблемай бягучага моманту.

Супярэчнасьці паміж вялікімі дзяржавамі, асабліва паміж Паўночна-Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі і Англіяй надзвычайна абвастрыліся. Але, ня гледзячы на гэты антаганізм, ня гледзячы на сусьветную барацьбу за калёніі, за рынкі, ёсьць адна вайсковая змова, у якой аб'яднаюцца ўсе імпэрыялістычныя дзяржавы, — гэта змова супроць СССР, супроць пралетарскай дзяржавы, якая будуе сацыялізм.

Імпэрыялісты дапамагаюць павялічэньню і магутнасьці ўзброеных сіл у суседніх з СССР дзяржавах. Ангельскі імпэрыялізм інтрыгуе ў Афганістане, каб ператварыць яго ў антысавецкую базу. Ён узмацняе свае індыйскія арміі. На Балканах ідзе працэс утварэньня базы для вайсковых апэрацый супроць СССР. У Кітаі ўрад забойцаў кітайскіх рабочых і сялян аднавіў свае правакацыі.

У гэтай падрыхтоўцы вайны сацыял-дэмакраты, якія паказалі сябе ў мінулую вайну здрадзнікамі і забойцамі працоўных, адыгрываюць усё ўзрастаючую ролю. Уся розьніца паміж іх паводзінамі ў мінулую вайну і сучаснымі паводзінамі ў тым, што ў 1914 годзе яны паказалі масам свой сапраўдны твар агентаў імпэрыялізму толькі пасьля таго, як вайна была абвешчана, зараз-жа яны адкрыта дапамагаюць імпэрыялістам падрыхтоўваць новую сусьветную бойню.

Роля ангельскай рабочай партыі, якая дапамагла кансэрватыйнаму ўраду пакінуць пражэньне пралетарыяту ў час усеагульнай забастоўкі, прыдушэньне венскага паўстаньня і г. д.—усё гэта паступовыя зьвеньні палітыкі сацыял-дэмакратыі.

Францускія сацыялісты ўтвараюць міністэрства паветранага флёту. Макданальд, які зноў стаў прэм'ерам ураду „яго вялікасьці", стараецца зачмуціць масы, упэўніць іх у сваіх мірных намерах. У Злучаных Штатах лідэр сацыялістычнай партыі Хільквіт, усхваляе дырэктара Джэнэрэл Электрык, арганізатара штрэйкбрэхэраў. Ва ўсім сьвеце сацыял-дэмакраты адыгрываюць вялікую ролю, як агэнты буржуазеі ў справе падрыхтоўкі вайны.

Сучасныя грозныя абставіны сьведчаць, што VI кангрэс Камінтэрну толькі выконваў свой абавязак перад рабочай клясай, абавязак кіраўніка рэвалюцыйнага руху, калі ён у сваёй рэзалюцыі пісаў:

„Кангрэс зазначае цэнтральным камітэтам усіх камуністычных партый, што яны безадкладна павінны распачаць палітычную, арганізацыйную і агітацыйна-прапагандысцкую працу па падрыхтоўцы да міжнароднага дню барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны і за абарону СССР. У гэты дзень працоўныя павінны дэманстраваць супроць наступленьня буржуазеі пад лёзунгамі; „Вайна імпэрыялістычнай вайне", „Адзіны рабочы фронт супроць наступу капіталістаў", «Абаронім Савецкі Саюз», „Падтрымаем рэвалюцыйную барацьбу калёніяльных нарэдаў", «Выкрыем хлусьню сацыял-патрыётаў», «Арганізуем пралетарскую абарону».

1-ае жніўня—15-ая гадавіна абвяшчэньня вайны было вызначана, як Міжнародны Чырвоны Дзень, і ва ўсім сьвеце ў гэты дзень адбудуцца вялізарныя дэманстрацыі і забастоўкі пратэсту супроць ваеннай небясьпекі.

Г. Уікс.

Вайны мы ня хочам, а ў бой—гатовы.

Падрыхтоўка да Міжнароднага Чырвонага Дню праведзена па менскіх саюзах і прадпрыёмствах здавальняюча. На фабрыках і заводах адбываліся агульныя сходы рабочых, на якіх ставіліся даклады аб міжнародным становішчы і аб значэньні Міжнароднага Чырвонага Дню.

Рабочыя добра разумеюць небясьпеку вайны, яны кажуць, што кожнае наша новае дасягненьне ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва ёсьць кол у грудзі ўсясьветным імпэрыялістам.

Апошні наглы налёт на Ўсходняй Кітайскую чыгунку кітайскіх фашыстаў рабочыя расцэньваюць, як правакацыю ўсясьветнай буржуазеі ўцягнуць нас у вайну.

Рабочыя патрабавалі ад свайго ўраду даць рашучы адпор зарваўшымся кітайскім імпэрыялістам і заяўляюць, што па першаму закліку партыі і ўраду яны зьменяць варштат на вінтоўку і ўстануць на абарону заваёў Кастрычніка.

Рабочыя патрабавалі ад савецкага ўраду выпуску III пазыкі індустрыялізацыі і запэўнілі, што поўная рэалізацыя яе забясьпечана. У рабочых—словы не разыходзіліся са справай, і яшчэ да выданьня дэкрату аб выпуску новай пазыкі на фабрыках і заводах шырока разгарнулася папярэдняя падпіска на пазыку. Падпіска на пазыку разгортваецца з кожным днём усё больш і больш.

— Мы вайны ня хочам,—заяўляюць рабочыя,—мы хочам працаваць у мірных умовах, мы хочам у мірных умовах будаваць сацыялізм у нашай краіне.

Але мы павінны ўзмацняць абароназдольнасьць краіны, павінны яшчэ больш шпаркім тэмпам разьвіваць індустрыялізацыю нашай бацькаўшчыны СССР, каб у патрэбную мінуту даць належны адпор.

Вось чаму сярод шырокіх мас рабочых і наогул працоўных, па іх уласнай ініцыятыве пачаўся збор сродкаў на пабудову новых самалётаў.

Сёньня рабочыя Менску, а таксама і ўсяго Савецкага Саюзу выйдуць на вуліцы, каб падкрэсьліць [illegible] гатоўнасьць сустрэць усе небясьпекі.

Напружаным тэмпам нашага будаўніцтва зробім непераможнай краіну саветаў у барацьбе з мірвым капіталам.

Няхай жыве Міжнародны Чырвоны Дзень—дзень мабілізацыі рэвалюцыйных сіл мірвога пралетарыяту для барацьбы з імпэрыялізмам, з ваеннай небясьпекай, для абароны СССР—бацькаўшчыны пралетарыяту!

ТОЛЬКІ ПЕРАМОГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ ВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ ПАКЛАДЗЕ КАНЕЦ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫМ ВОЙНАМ. ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, РЫХТУЙЦЕСЯ ПЕРАТВАРЫЦЬ ВАЙНУ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНУЮ Ў ВАЙНУ ГРАМАДЗЯНСКУЮ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМІНТЭРН—ШТАБ СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ Ў БАРАЦЬБЕ СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ—НЯХАЙ ЖЫВЕ САВЕЦКАЯ УЛАДА ВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ МІЖНАРОДНЫ ЧЫРВОНЫ ДЗЕНЬ!

На гледзячы на шалёныя рэпрэсіі, пралетарыят капіталістычных краін 1-га жніўня прадэманструе сваю гатоўнасьць даць адпор падпальшчыкам новай імпэрыялістычнай вайны.

Тысячы палоньнікаў фашызму.

ПОЛЬСКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ У ПЕРШЫХ ШЭРАГАХ БАРАЦЬБІТОЎ СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ.

ВАРШАВА, 30-7. У сувязі з надыходзячым днём 1 жніўня па ўсёй Польшчы пракацілася хваля новых аблаў і арыштаў.

Учора ў Варшаве была наладжана ў рабочых райёнах аблава, у часе якой арыштавана 80 рабочых. Арыштаваныя перададзены ў загад паліцыйнай паліцыі.

У Лодзі кожную ноч паліцыя наладжвае масавыя вобыскі, аблавы і ўчыняе арышты. Арыштавана больш за 150 чалавек, з якіх некалькі дзесяткаў арыштавана ў памяшканьні лодзінскай арганізацыі ППС—лявіцы.

У Вільні таксама была наладжана аблава і вобыскі, у выніку чаго арыштавана больш за 100 чалавек.

У райёне Навгрудку паліцыя арыштавала вучняў беларускай гімназіі, якіх абвінавачвае ва ўдзеле ў падрыхтоўцы першажнівеньскай дэманстрацыі.

У Львове была ўчынена аблава і масавыя вобыскі. Арыштавана 304 ч.

Аднак, увечары на рабочых акраінах былі ўзьняты чырвоныя сьцягі з лёзунгамі да 1 жніўня за абарону СССР.

Ня пусьціць паліцыі ў завадзкія памяшканьні.

ПАРЫЖ, 30-7. У Сэнт-Эт'ене, не зважаючы на забарону, вобыскі і арышты, адбыўся рабочы зьезд басэйну Луары з удзелам прадстаўнікоў рэвалюцыйнага саюзу былых удзельнікаў вайны, жаночага саюзу барацьбы проці вайны і унітарных прафсаюзаў. Ухваленая зьездам рэзалюцыя падкрэсьлівае значэньне басэйну Луары, як цэнтру францускай вайсковай прамысловасьці і заклікае рабочых басэйну спыніць працу і выйсьці на дэманстрацыю 1 жніўня.

Такія-ж рэзалюцыі ўхвалілі капальнікі ў Асе на зьезьдзе басэйну Гар і рабочы зьезд тэкстыльшчыкаў і мэталёўцаў паўночнага раёну ў Лілі. У Парыжы, не зважаючы на шматлікія арышты, выканком раённай фэдэрацыі унітарных прафсаюзаў праводзіць далей сваю працу і кіруе падрыхтоўкаю да дню 1 жніўня.

На некаторых заводах у Парыжы і ваколіцах рабочыя ўхвалілі не дапушчаць паліцыі ў заводзкія памяшканьні. Сэкцыя чужаземных рабочых унітарнай фэдэрацыі працы агаласіла адозву, у якой, пратэстуючы проці арыштаў рабочых арабаў на сходзе ў Вільнэў-Сэн-Жарж, заклікае рабочых дэманстраваць 1 жніўня.

Чырвоныя франтавікі рыхтуюцца.

БЭРЛІН, 30-7. У шмат якіх гарадох Рурскай вобласьці сябры саюзу Чырвоных Франтавікоў, апранутыя ў форму, раздавалі ля фабрычнай брамы лятучкі з пратэстам проці забароны саюзу Чырвоных Франтавікоў і з заклікам да рабочых удзельнічаць у дэманстрацыях 1-га жніўня.

Рэфармісты і паліцэйскія заключылі саюз

ПАРЫЖ, 30-7. Рэфармісцкія прафсаюзныя арганізацыі ўжываюць усе захады да зрыву Чырвонага дню, агаласіўшы адозвы, у якіх заклікаюць рабочых ня брацьдзелу ў дэманстрацыях 1 жніўня, а таксама „рашуча вроцідзейнічаць спыненьню працы ў дзень 1 жніўня".

Як павядамляе „Пці Журналь", да пастановы рэфармісцкай канфэдэрацыі працы далучыліся „хрыстыянскія" і анарха-сындыкалісцкія прафсаюзы.

З свайго боку прэфэкт дэпартаманту Сэны загадаў адміністрацыі гарадзкіх прадпрыёмстваў накладаць дысцыплінарныя ўзысканьні на ўсіх служачых і рабочых, якія спыняць працу ў дзень 1 жніўня.

Арышт кітайскіх камунараў.

ПЕЙПІН. Згодна паведамленьня «Норд Чайна Стандарт», паліцыя арыштавала тут 5 чалавек, западозраных у прыналежнасьці да кітайскай кампартыі, выкрыўшы камуністычную літаратуру і агнястрэльную зброю.

Мясцовая ўлада атрымала загад нанкінскага ўраду аб забароне мітынгаў і дэманстрацый і аб пільным наглядзе за камуністамі ў зьвязку з надыходзячым Міжнародным чырвоным днём 1 жніўня.

Арышты і вобыскі ня спыняюцца.

ПАРЫЖ, 30-7. У Парыжы і ў правінцыі ня спыняюцца вобыскі ў рабочых арганізацыях і ў рэдакцыях органаў рабочага друку, а таксама арышты рабочых, якія распаўсюджваюць лістоўкі і прадаюць камуністычныя газэты.

Забарона дэманстрацыі 1-га жніўня.

ГЭЛЬСІНГФОРС, 30-7. Урад забараніў мітынгі і дэманстрацыі ў дзень 1 жніўня.

„Папярэдзіць усімі сродкамі".

ВЕНА, 30-7. Па ўсёй Баўгарыі ня спыняюцца арышты з мэтаю недапушчэньня дэманстрацый у дзень 1-га жніўня.

На ўсёй Румыніі мабілізаваны паліцэйскія сілы „для папярэджаньня ўсімі сродкамі" дэманстрацыі 1 жніўня. У некаторых гарадох павялічаны вайсковыя гарнізоны.

Забарона сходаў.

БЭРЛІН, 30-7. У Мюнхене забаронены 1-га жніўня ўсе дэманстрацыі і сходы, у тым ліку і ў зачыненых памяшканьнях.

Мабілізацыя жандараў.

ПАРЫЖ, 30-7. Агенцтва Гаваса паведамляе з Брусэлю: „Лібр Бэльжык" (орган католікаў) паведамляе, што ў часе авіяцыйных сьвяткаваньняў у Вэрв'е былі выкліканы ўсе жандары з гораду Вэрв'е і Спа і накіраваны на мяжу з тым, каб не прапусьціць 600 нямецкіх рабочых - камуністаў, якія спрабавалі перайсьці мяжу для наладжаньня дэманстрацыі на бэльгійскай тэрыторыі. Дэманстранты былі адагнаны назад за кардон.

Дэманстрацыя жанчын-работніц.

БЭРЛІН, 30-VII. У Эсэне адбылася канфэрэнцыя жанчын-работніц Рурскай вобласьці. Пасьля сканчэньня канфэрэнцыі адбылася жаночая дэманстрацыя проці імпэрыялістычнай вайны з удзелам „чырвонага жаночага саюзу".

Выйдуць на вуліцу.

БЭРЛІН, 30-7. У Нюрэнбэрзе нелегальна адбылася дэлегацкая канфэрэнцыя фабрычна-заводзкіх камітэтаў Нюрэнбэргу і Фурту. Сацыял-дэмакратычны паліцэй-прэзыдэнт Нюрэнбэргу забараніў „усякую падрыхтоўку да правядзеньня Чырвонага дню". На канфэрэнцыі прысутнічала 150 дэлегатаў, з якіх большасьць былі беспартыйныя. Сярод дэлегатаў было таксама шмат радавых сяброў сацыял-дэмакратычнай партыі.

Канфэрэнцыя ўхваліла адозву, якая заклікае рабочых да масавых дэманстрацый у дзень 1-га жніўня, а таксама да пратэсту проці агульнанямецкага збору нацыянал-сацыялістаў (фашыстаў) назначанага ў Нюрэнбэрзе на 4-га жніўня.

Братаньне рабочых з салдатамі.

ПАРЫЖ, 30-7. „Юманітэ" паведамляе, што ў нядзелю ў Аахене ў часе міжнароднай дэманстрацыі проці імпэрыялістычнай вайны на шмат якіх памяшканьнях у рабочых райёнах гораду, не зважаючы на паліцэйскія забароны, былі вывешаны чырвоныя сьцягі. Праходзячы каля казарм бэльгійскага акупацыйнага войска, дэманстранты браталіся з салдатамі Бэльгіі.

Прыдушыць парушэньне „волі працы".

ПАРЫЖ, 30-7. Агенцтва Гаваса паведамляе: „У зьвязку з днём 1-га жніўня ўрад афіцыйна забараніў усе працэсіі, мітынгі і зборы на вуліцах і пляцох. Урад будзе энэргічна прыдушваць кожнае парушэньне волі працы, а таксама гвалты проці прадстаўнікоў улады, і выпле з Францыі ўсіх чужаземцаў, якія возьмуць удзел у маніфэстацыях".

Паліцэйскі нагляд над камуністамі.

ПАРЫЖ, 30-VII. Згодна паведамленьня з Брусэлю, урадавыя рэпрэсіі ў Бэльгіі ня спыняюцца. У Шарлуа Учынены вобыскі ў памяшканьні мясцовай арганізацыі кампартыі і на кватэрах некаторых камуністаў. У Брусэлі паліцыя ўстанавіла неафіцыйны нагляд над большасьцю сяброў мясцовай арганізацыі кампартыі.

Дэманстрацыі пад лёзунгамі 1-жніўня.

СТАКГОЛЬМ, 29-VII. Ва Ўпсале адбыўся ўчора наладжаны шведзкім камсамолам юнацкі дзень, праведзены пад лёзунгамі 1-га жніўня. Пасьля мітынгу адбылася дэманстрацыя, у часе якой паліцыя канфіскавала адзін плякат з надпісам, якая, на яе думку, падрывала дысцыпліну ў арміі.

Пад уціскам капіталу

Галадаюць 31 дзень

ВЕНА, 30-VII. Водлуг паведамленьня з Бухарэсту, разгляд у судзе другой інстанцыі справы засуджаных па так званым «працэсе камуністаў» у Кляўзэнбэрзе назначан на 8-га жніўня. Засуджаныя па гэтым працэсе галадаюць ужо 31-шы дзень, патрабуючы прыстасаваць да іх амністыю. Мясцовыя газэты ня ўпэўнены, што галадаючыя дажывуць да разгляду справы ў судзе другой інстанцыі.

Павялічваюць рабочы дзень.

ЛЁНДАН, 30-VII. У Калькуце (Індыя) прадпрыёмцы джутавай прамысловасьці абвясьцілі аб аднаўленьні 60-цігадзіннага рабочага тыдню. Гэта выклікала бурнае абурэньне сярод рабочых. На 10-ці прадпрыёмствах ужо абвешчана забастоўка.

Па 5 гадоў катаргі

ВЕНА, 27. Згодна паведамленьня з Белграду надзвычайны суд прыгаварыў 5 рабочых на тэрміны ад 2-х да 5 гадоў за распаўсюджаньне першамайскіх праклямацый камуністычнай партыі.

Галадоўка палітзьняволеных.

ПАРЫЖ, 29-7. Палітычныя зьняволеныя ў парыскім астрозе Сантэ, у жаночым астрозе Сэн-Лазар і ў дзіцячым астрозе Піт-Ракет колькасьцю ў 150 чал. абвясьцілі галадоўку.

„Юманітэ" зазначае, што выступленьне гэтае зьяўляецца палітычным актам, адобраным ЦК кампартыі і бюро унітарнай канфэдэрацыі працы, у знак пратэсту проці фашысцкіх гвалтаў ураду нацыянальнага прыгнечаньня.

АНГЛА-САВЕЦКІЯ АДНОСІНЫ.

ТОЛЬКІ ПРАЗ ДВА МЕСЯЦЫ МОГУЦЬ ПАЧАЦЦА АНГЛА-САВЕЦКІЯ ПЕРАМОВЫ.

ЛЁНДАН, 30-7. Лібэральная „Дэйлі Кронікль" у перадавіцы так абмяркоўвае гутарку між т. Даўгалеўскім і Гэндэрсонам: „Перамовы могуць патрабаваць некаторага часу, але кожны разумны чалавек павінен жадаць посьпеху іх. Мы ня можам дамагчыся ўсіх ганддёвых пераваг, якімі карыстаюцца ў СССР немцы, калі ў Маскве ня будзе ангельскага дыплёматычнага прадстаўніка. Грамадзкая думка не павінна з гэтае прычыны дазваляць, каб яе перакрычаў лямант проці чырвоных. Больш таго, грамадзкая думка павінна разглядаць такі лямант як антыпатрыятычную спробу напаскудзіць Англіі ў шкоду яе нацыянальным інтарэсам. Перад Гэндэрсонам і іншымі міністрамі стаіць нацыянальная задача. Трэба даць ім магчымасьць выканаць яе. Яны могуць пацярпець няўдачу, бо, апроч штучных перашкод, ёсьць таксама і сапраўдныя перашкоды. Але нельга дапушчаць, каб гэтыя перашкоды яшчэ павялічваліся".

„Манчэстэр Гардыян" піша: „З прычыны таго, што Гэндэрсон накіроўваецца спачатку ў Гаагу, а потым у Жэневу—толькі праз 2 месяцы могуць распачацца якія-небудзь сапраўдныя перамовы аб аднаўленьні англа-савецкіх зносін".

„АНГЕЛЬЦЫ" НЕ АДМОВЯЦЦА АД БАРАЦЬБЫ З КАМУНІЗМАМ.

ЛЁНДАН, 30-7. Наконт перамоў т. Даўгалеўскага з Гэндэрсонам „Юінг Стандарт" (вячэрняя газэта, якая выдаецца трэстам Бівэрбрука) піша: «Бальшавікі ніколі ня спыняць выкрываць капіталізм у Англіі. Гэтак сама і ангельцы ніколі не адмовяцца ад выкрываньня камунізму. Аднаўленьне дыплёматычных зносін з СССР—справа здаровага розуму, але няма ніякага сэнсу ў дыплёматычным абмене гарантыямі па пытаньні аб прапагандзе".

Тав. Межлаук—аб дагаворы з Фордам.

МАСКВА, 30-7. Намесьнік старшыні ВСНГ СССР т. Межлаук, які вярнуўся з Амэрыкі, паведаміў супрацоўніку ТАСС падрабязнасьці згоды з Фордам і некаторымі іншымі амэрыканскімі фірмамі.

Мэтаю майго падарожжа ў Амэрыку—сказаў т. Межлаук,—было прыцягненьне тэхнічнай дапамогі для пабудовы ў СССР аўтазаводу на 100 тысяч машын у год, рэканструкцыі заводу АМО і для заснаваньня вытворчасьцяў, якія абслугоўваюць аўтабудаўніцтва.

Як вядома, Форд па ўгавору перадае нам усе свае патэнты і магчымыя ў далейшым тэхнічныя ўдасканаленьні тыпу яго машын і г. д.

Такое-ж абавязацельства мы ўзялі і на сябе, бо Форд лічыць, што савецкая сыстэма спрыяе вынаходкам і высокі тэхнічны ўзровень нашага інжынэрства бясспрэчна прыводзіць да таго, што ў вырабе фордаўскіх машын на нашых заводах нашымі тэхнікамі будуць зроблены некаторыя паляпшаньні.

Ва ўгаворы няма ніякага абмежаваньня прывозу ў СССР машын іншых марак, апроч фордаўскіх, бо Форд упэўнен у перавагах свайго тыпу аўтамабілю.

Форд распачаў ажыцьцяўленьне ўгавору з намі з вялікаю ахвотаю. Форд вылучыў лепшых сваіх інжынэраў для тэхнічнай дапамогі групе савецкіх інжынэраў, якія знаходзяцца ў Амэрыцы і заняты распрацоўкаю праэкту ніжагародзкага заводу. Кіраўнікі фірмы Форда Сарэнсон і Рокельман прыяжджаюць у СССР для азнаямленьня з месцам пабудовы аўтазаводу і зборачных майстэрняў, тэхнічнай кансультацыі і г. д.

За час майго пабыту ў Амэрыцы ўдалося таксама падпісаць угавор аб тэхнічнай дапамозе пры будаўніцтве Сталінградзкага трактарнага заводу з самай буйнай амэрыканскай фірмай «Альбэрт Кан», якая ўзяла на сябе распрацоўку праэкту пляну заводу. Інжынэры фірмы распрацавалі праэкт заводу з рэкордная, нават для Амэрыкі, хуткасьцю.

Дзякуючы гэтаму мы маем магчымасьць шпарка заказаць канструкцыі гэтага заводу амэрыканскай фірме „Мак Клітык" і „Маршал", прычым і гэта фірма таксама выканала заказ з рэкордная шпаркасьцю.

Застой на Усходня-Кітайскай чыгунцы.

Бясчынства кітайскай паліцыі.

УЛАДЫВАСТОК, 30-7. Тут атрыманы весткі, што кітайская ўлада ў Харбіне ўстанавіла кантроль над дзейнасьцю Дальбанку, назначыўшы для гэтага чыноўніка з паліцэйскага кіраўніцтва. На чыноўнікаў ускладзен абавязак папярэдняга кантролю ўсіх аперацый банку, у тым ліку і касавых. Адначасна кітайская ўлада патрабавала ад праўленьня Дальбанку перадачы кантралёрам найбольш важных ключоў ад кас і складаў. Свае загады па банку чыноўнікі аддаюць пагражаючы арыштам служачым.

Згодна інструкцыі паліцэйскім кантралёрам дадзена права арыштоўваць кожнага, хто ўвойдзе ў банк, калі ён пакажацца падазроным. Поўная беззаконнасьць і бясчынствы ўлады пазбаўляюць Дальбанк магчымасьці працаваць.

Масавае дэзэртырства ў кітайскай арміі.

ЧЫТА, 28-7. У Манчжурыі сярод кітайскага войска настрой перапуду. Нашырэецца масавае дэзэртырства. У мінулую ноч уцякло са зброяй некалькі сот салдат, захапіўшы з сабою горную гармату і бамбамёт. Гандляры і белагвардзейскія элемэнты эвакуюцца ў Харбін. Уся кітайская і белая паліцыя пагрузілася ў вагоны. Арышты прафпрацаўнікоў у Харбіне ня спыніліся, таксама, як і забойствы і вывезкі.

Пазіцыя Японіі.

ТОКІЁ. У гутарцы з прадстаўнікамі друку прэм'ер Хамагуцы заявіў, што лепшым спосабам упарадкаваньня савецка-кітайскага канфлікту былі-б непасрэдныя перамовы, і што „Японія ня думае ў сучасны момант рабіць якія-небудзь актыўныя крокі, ці выступаць у якасьці пасрэдніка".

Хлусьня буржуазнага друку аб савецка-кітайскіх перамовах.

БЭРЛІН, 30-VII. Паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Нямеччыне разаслала адхіленьне газэтных паведамленьняў, якія зьмяшчаліся за апошні тыдзень ужо 3 разы з розных крыніц аснованых па сутнасьці на інфармацыі кітайскага ўраду аб перамовах, якія, нібыта, адбываюцца між паўнамоцным прадстаўніком СССР і кітайскім пасланьнікам.

Наконт надасланай з Вашынгтону дадатковай „папраўкі", якая завярае, што перамовы ў Бэрліне яшчэ не праводзіліся, але што паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Бэрліне зрабіла, нібыта, крокі, каб падрыхтаваць глебу дзеля гэтага ў кітайскага пасланьніка,—савецкае паўнамоцнае прадстаўніцтва заявіла, што і ў гэтым апошнім паведамленьні, як і ў папярэдніх, няма ніводнага слова праўды.

Грамадзкія колы Кітаю—за ліквідацыю канфлікту з СССР.

УЛАДЫВАСТОК, 25-7. Водлуг атрыманых тут вестак, у Харбіне ходзяць упартыя чуткі, што сярод мукдэнскай улады ў апошні час перамагае плынь, якая дамагаецца вырашэньня канфлікту з СССР [illegible] згоду адпаведна прапаноў савецкай ноты.

Паведамляюць таксама, нібыта Чжан-Сюэ-Лян пачаў схіляцца да мірнага вырашэньня канфлікту. У Харбіне заявяяюць, што мукдэнская ўлада зрабіла крокі да таго, каб давесьці да ведама СССР аб гэтых сваіх намерах.

Дальбанк ліквідуе сваю працу.

МАСКВА. З прычыны немагчымасьці для Дальбанку праводзіць далей сваю дзейнасьць старшыня праўленьня Дзяржбанку т. Пятакоў тэлеграфаваў старшыні праўленьня Дальбанку аб неабходнасьці ліквідаваць працу.

Аднавіць ранейшы парадак на УК чыгунцы.

ТОКІЁ. Японскі друк выказваецца за неабходнасьць аднавіць ранейшы парадак на Усходня-Кітайскай чыгунцы, згодна савецка-кітайскага ўгавору.

Мангольскія працоўныя—за абарону СССР

УЛАН-БАТОР, 30-VII. Цэнтральны камітэт і цэнтральная кантрольная камісія народна-рэвалюцыйнай партыі Манголіі і ЦК рэвалюцыйнага саюзу мангольскай моладзі, а таксама цэнтральны савет мангольскіх прафсаюзаў ухвалілі на аб'яднаным пасяджэньні, рэзалюцыю з выказам абурэньня працоўных Манголіі ўчынкамі кітайстай улады, якая зьневажае інтарэсы мілёнаў працоўных Кітаю і парушае па загаду імпэрыялістычных дзяржаў Японіі і Англіі падпісаныя з СССР угаворы і правакуе вайну.

Рэзалюцыя заклікае бядняцкія і пралетарскія масы ўсяго сьвету стаць на абарону СССР, рашучай барацьбе з небясьпекаю вайны, да аб'яднаньня ўсіх натуг з мэтаю абароны вольнага ладу і тэрыторыі Манголіі ад розных наскокаў.

Правакацыйны наскок на яхту „Мэталёвец".

ГЭЛЬСІНГФОРС, 28 ліпеня а 11-й гадз. увечары ў Гэльсінгфорскім порце на стаячую на якары пры запаленым агні савецкую яхту „Мэталёвец" наскочыў фінскі параход „Астры", які зрабіў яхце значныя пашкоджаньні. Ёсьць падставы думаць, што такі ўчынак зроблен знарок.

* * *

ГЭЛЬСІНГФОРС, 29-7. Водлуг пэўных вестак, фінскі параход, які наскочыў ў нядзелю на савецкую яхту «Мэталёвец», дзейнічаў з загадзя абдуманаю правакацыйную мэтаю. Фінская паліцыя трымала сябе надзвычайна дрэнна ў часе аварыі і пасьля яе. Капітану пацярпеўшай яхты было забаронена сыйсьці на ўзьбярэжжа, каб заявіць пратэст. Толькі на другі дзень пасьля ўмешаньня паўнамоцнага прадстаўніцтва праз міністэрства замежных спраў паліцыя пусьціла капітана на ўзьбярэжжа.

Неабходна адзначыць, што савецкія яхты „Мэталёвец" і „Рэвалюцыя" з самага пачатку спаткалі недапусьцімыя да сябе адносіны з боку фінскай улады. Насупроць міжнародным звычаям і таму прыёму, які робіцца фінскім суднам у савецкіх партох, каманды не атрымалі дазволу сыйсьці на ўзьбярэжжа, а пазьней ім дазволілі, не зважаючы на пратэст паўнамоцнага прадстаўніцтва, сходзіць штодня на 3 гадзіны. Гэтыя адносіны фінскай улады зьяўляюцца працягам леташніх прасьледаваньняў савецкіх яхтаў у фінскіх водах, што выклікала ў выніку дыплёматычныя пратэсты савецкага ўраду.

Колькі Расеі каштавала вайна.

МАСКВА. 4 дэлегаты рабочых Балтыцкага заводу наведаліся да Народнага Камісара Фінансаў СССР т. Бруханава і мелі з ім доўгую гутарку. У зьвязку з асабліваю зацікаўленасьцю, выказанаю дэлегатамі да пытаньня аб царскіх даўгох, т. Бруханаў падрабязна інфармаваў рабочых дэлегатаў аб даўгох, зробленых царскім урадам унутры краіны і заграніцаю.

Да 1914 году сума доўгу дзяржавы па пазыках складала 13 міліярдаў руб. За час вайны былі зроблены дадатковыя пазыкі на 31 міліярд рублёў. На душу насельніцтва перад вайною прыпадала 98 руб. дзяржаўнага доўгу, а за час вайны гэтая сума павялічылася да 377 руб.

Тав. Бруханаў на запытаньне дэлегатаў ленінградзкіх пралетарыяў аб канцы апошніх буйных войн паведаміў, што японская вайна каштавала царскай Расеі 2 з паловаю міліярды рублёў, а імпэрыялістычная вайна 1914 году—каля 60 міліярдаў рублёў.

ЦІ МАГЧЫМЫ НОВЫЯ РЭВАЛЮЦЫІ БЕЗ ВАЙНЫ?

Гэта пытаньне вельмі важнае, гэта адно з вузлавых пытаньняў усёй тактыкі ленінізму.

Ні Маркс, ні Ленін ніколі ня лічылі, што рэвалюцыя нараджаецца толькі з вайны. Яны толькі лічылі, што некаторыя войны пры вядомых абставінах зьяўляюцца „ускорителями" рэвалюцыйнага разьвіцьця. Рухаючыя сілы ўсякай рэвалюцыі гэта—клясавыя супярэчнасьці, клясавая барацьба. Вайна ёсьць працяг палітыкі толькі іншымі сродкамі. Войны пры пэўных абставінах могуць у пэўных краінах паскорыць рэвалюцыю. Але нараджаюць рэвалюцыю супярэчнасьці паміж клясамі, барацьба клясаў.

У такім адказным дакумэнце, як ленінскія тэзісы «Сацыялістычная рэвалюцыя і права нацый на самавызначэньне», Ленін у 1916 г. пісаў так:

„Сацыялістычная рэвалюцыя можа разгарэцца ня толькі з-за буйнай стачкі, вулічнай дэманстрацыі, або галоднага бунту, ад вайсковага паўстаньня, або калёніяльнага мецяжу, але з-за кожнага палітычнага крызісу, накшталт справы Дрэйфуса, ці Цаберынскага інцыдэнту, ці ў сувязі з рэфэрэндумам па пытаньні аб аддзяленьні прыгнечаных нацый і г. д." (Том XIX, стар. 170).

Вось праграмная заява Леніна, якая не пакідае месца ніякім крыватлумачэньням. На гэту заяву спасылаўся Ленін і ў часе III кангрэсу Камінтэрну ў камісіі, якая выпрацоўвала тактычную рэзалюцыю. Гэтай думкай цалкам прасягнута тактычная рэзалюцыя III кангрэсу, у складаньні якой Ленін прымаў кіруючы ўдзел.

Сацыялістычная рэвалюцыя, казаў Ленін, можа распачацца ня толькі з вайсковага паўстаньня, або калёніяльнага мецяжу, але з буйнай стачкі, з палітычнага крызісу, як справа Дрэйфуса і г. д., і г. д.

Чым больш набліжалася пралетарская рэвалюцыя, тым больш напружана думаў Ленін аб тым, які менавіта будзе канкрэтны ход гэтай рэвалюцыі. Як у 1905 г. на III зьезьдзе кампартыі, напярэдадні першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расеі Ленін напружана думаў аб тым, які менавіта будзе канкрэтны ход гэтай рэвалюцыі, якімі будуць канкрэтна формы руху (злучэньне агульнай стачкі з узброеным паўстаньнем і г. д.)—так, напярэдадні 1917 г. Ленін усё глыбей разважаў менавіта над пытаньнем аб тым, якімі будуць канкрэтныя формы разьвіцьця рэвалюцыі сацыялістычнай.

«Сацыяльная рэвалюцыя ня зможа ўтварыцца інакш, як у выглядзе эпохі, якая злучае грамадзянскую вайну пралетарыяту з буржуазеяй і цэлы шэраг дэмакратычных, рэвалюцыйных, у тым ліку і нацыянальна-вызваленчых рухаў у неразьвітых, адсталых і прыгнечаных нацыях" (том XIII, 369)—пісаў Ленін у сваім палемічным артыкуле „Імпэрыялістычны эканамізм", накіраваны супроць „левых" камуністаў таго часу (т. т. Пятакоў, Бухарын і інш.).

„Думаць, што магчыма сацыялістычная рэвалюцыя без паўстаньня дробных нацый у калёніях і ў Эўропе, без рэвалюцыйнага выбуху часьці дробнай буржуазеі з усімі яе забабонамі, бяз руху несьвядомых пралетарскіх і напаўпралетарскіх мас супроць абшарніцкага, царкоўнага, манархічнага нацыянальнага і г. д. прыгнечаньня, разважаць гэтак,—значыць, адмовіцца ад сацыялістычнай рэвалюцыі». (XIX, 219),—пісаў Ленін у палеміцы супроць прыхільнікаў Розы Люксэмбург.

Ні ў якім разе ў гэтых клясычных вызначэньнях Леніна нельга знайсьці тэй „думкі", быццам рэвалюцыі магчымы **толькі** ў сувязі з вайной.

Вайна ёсьць працяг палітыкі. Імпэрыялістычныя войны—ёсьць працяг імпэрыялістычнай палітыкі. Гэтыя войны зьяўляюцца важнейшым паказальнікам таго, што растуць клясавыя супярэчнасьці ў нацыянальным і ў інтэрнацыянальным маштабе, што абвастраецца барацьба па ўсім сьвеце, што цесна вытворчым сілам у нацыянальных рамках, што шпарка коціцца капіталізм да пагібелі.

Вайна пры паўных абставінах робіцца вялізарным „**ускорителем**" рэвалюцыйнага руху.

Найбольш яскравым прыкладам гэтага можна было-б узяць ролю імпэрыялістычнай вайны ў рускай рэвалюцыі 1917 году.

Насьпяваньне рэвалюцыйнага крызісу ў Расеі з 1912 г. ішло з вялікай шпаркасьцю. У 1914 г. рэвалюцыйны ўздым у Расеі дасягнуў ужо вельмі вялікай інтэнсыўнасьці. Не задоўга да абвяшчэньня вайны справа даходзіць ужо ў Ніцеры да барыкад. Вайна спачатку на некаторы час **затрымала** далейшы рэвалюцыйны ўздым, але затое пасьля ў надзвычайнай меры **паскорыла** рэвалюцыйнае разьвіцьцё ў Расеі. У 1917 годзе ў Расеі выбухнула **першая** з вялікіх рэвалюцый у часе вайны менавіта таму, што ўжо ў 1914 г. Расея была бліжэй за ўсіх да рэвалюцыі, іменна таму, што Расея была цяжарна рэвалюцыяй.

Пералічваючы „абавязковыя" канстытуцыйныя адзнакі рэвалюцый, Ленін ні ў якім разе не гаворыць, што ў ліку іншых адзнакаў „абавязковай" адзнакай зьяўляецца вайна. Ленінская фармуліроўка „асноўнага закону рэвалюцыі", зразумела, **ні ў якім разе ня выключае** (а дапушчае), што пры вядомых абставінах можа паслужыць вялізарным „**ускорителем**" рэвалюцыі. Але нідзе ў Леніна вы ня знойдзеце і намёка на тое, што **толькі** з вайны можа распачацца рэвалюцыя.

Бальшавізм увайшоў у імпэрыялістычную вайну 1914 году з лёзунгам дэмакратычнай дыктатуры пралетарыяту і сялянства для **Расеі**. Бальшавізм да канца вайны агаласіў **сацыялістычную** рэвалюцыю і для **Расеі**. Роля імпэрыялістычнай вайны **ня толькі як „ускорителя"**, але як «углыбителя» рэвалюцыі тут відавочна.

Але сказаць „рэвалюцыя можа нарадзіцца толькі з вайны"—гэта значыць быць **пацыфістам навыварат**; гэта значыць у сучасных абставінах падаць палец апартунізму, а апартунізм возьме ўсю руку.

* * *

Бальшавікі гаворацьь, што эпоха, у якую мы жывём, ёсьць эпоха войн і рэвалюцый. І правільна гаворацьь. Возьмем мінулае дзесяцігодзьдзе з дню сканчэньня сусьветнай вайны. Гэтае дзесяцігодзьдзе лічаць, як дзесяцігодзьдзе „мірнага" разьвіцьця капіталізму. Яно сапраўды «мірнае» ў параўнаньні з 1914-1918 г. г., калі кроў лілася рэкой, калі на палёх імпэрыялістычнай бойні гінулі мілёны, калі паліліся сёлы і гарады і спусташаліся цэлыя вобласьці. Але калі параўнаць гэта дзесяцігодзьдзе (1918-28 г.) з дзесяцігодзьдзем, скажам, даваенным (1904-1914 г.), дык стане ясна, які „мірны" характар дзесяцігодзьдзя, што прайшло з часу сканчэньня сусьветнай вайны. У працягу дзесяцігодзьдзя 1918-28 г. мы бачылі шэраг войн, у кожным разе шэраг буйных ваенных сутычак ня толькі ў Эўропе, але і ў Азіі, у Афрыцы, Амэрыцы. Невялічкі і **вельмі поўны** пералік вялікіх і малых сутычак, якія мелі месца за гэты час, упэўняць нас у гэтым.

Эўропа. Барацьба Нямеччыны з Польшчай з-за Верхняй Сілезіі. Узброеная акупацыя Руру і так званае пасыўнае супраціўленьне ў 1923 г. Захоп Польшчай Віленшчыны і шэраг узброеных пагранічных сутычак паміж Польшчай і Літвой. Захоп Італіяй правінцыі Фіумэ, італа-грэцкі канфлікт. Грэка-турэцкая вайна, г. зн. па справе англа-турэцкая вайна. Балканская ўзброеная барацьба з-за тэрыторыі. Захоп Румыніяй шэрагу зямель, якія ўваходзілі ў былую Аўстра-Вэнгрыю.

Азія. Грамадзянская вайна ў Кітаі і інтэрвэнцыя імпэрыялістаў. Вайна Францыі ў Сірыі і г. д.

Афрыка. Войны ў Мароко.

Амэрыка. Злучаныя Штаты і Мэксіка. Злучаныя Штаты—Нікарагуа, Балівія—Парагвай і шэраг іншых.

Мы не гаворым ужо аб вялізарнай грамадзянскай вайне ў СССР і аб знадворнай вайне проці СССР, у якой прымала ўдзел, як вядома, ня менш 14 дзяржаў. Не гаворым ужо аб вайне белай Польшчы проці Саветаў у 1920 годзе і г. д.

Мы жывем у эпоху войн і рэвалюцый. У гісторыі ўжо ня раз было, што вайна паскарала рэвалюцыйнае разьвіцьцё, а рэвалюцыя ў сваю чаргу прыводзіла да новых войн. Ды самі войны ня раз зьмянялі, як кажуць, «на ходу» свой характар. Грунтоўнае становішча марксысцкай дыялектыкі складаецца з таго, што ўсе межы ў прыродзе і грамадзкасьці ўмоўны і парушны, што няма **ніводнага** зьявішча, якое ня здолела-б пры вядомых умовах ператварыцца ў сваю процілеглась.

Калі мы, вучні Леніна, сьледам за ім гаворым, што мы жывем у эпоху войн і рэвалюцый—то гэта ні ў якім разе ня значыць, што рэвалюцыя можа нарадзіцца толькі з вайны. Рэвалюцыя можа вынікнуць з вялікай сутычкі—гаварыў Ленін у 1916 годзе. Рэвалюцыя магла нарадзіцца з вялікай сутычкі гарнякоў, з усеагульнай забастоўкі ў гэткай краіне, як Англія, у 1926 г. Рэвалюцыя ў Англіі можа вынікнуць з усеагульнай сутычкі, якая перарастае ў паўстаньне—у Індыі. Рэвалюцыя ў Аўстрыі магла вынікнуць з Венскага паўстаньня. А хто асьмеліцца сказаць, што рэвалюцыя ў Нямеччыне немагчыма без вайны? Ці-ж з падзей падобнага тыпу, як маёўка 1929 году, у Бэрліне ня можа вынікнуць рэвалюцыя? Хто асьмеліцца сказаць, што рэвалюцыя ў Італіі,—калі фашызм згніе,—немагчыма будзе без вайны? Хто скажа, што рэвалюцыя ў балканскіх дзяржавах немагчыма без вайны?

Але зьвесьці ленінскае вучэньне аб вайне і рэвалюцыі да таго, што рэвалюцыя немагчыма без вайны,—значыцца „обкорнать, окургузить" вучэньне Леніна, значыць сказіць яго ў апартуністычным духу.

З вучэньнем Маркса і Леніна аб вайне патрэбны адносіны асабліва асьцярожныя. Гэта неабходна таму, што мы жывём у эпоху войн і рэвалюцый, менавіта таму, што новая вайна, у якой зноў будзе вырашацца лёс савецкай улады і лёс сусьветнай рэвалюцыі наогул, бязумоўна, насоўваецца.

Гісторыя вучыць нас,—гаварыў Ленін,—што ніводнае буйнае пытаньне, ніводная рэволюцыя не нарадзілася інакш, як у шэрагу войн. Трэба быць гатовым да таго, што пры самай малой зьмене становішча імпэрыялістычныя драпежнікі зноў накінуцца на нас. Трэба быць гатовым да гэтага. Пытаньне іменна стаіць так: доўгі шэраг войн да гэтага часу вырашаў лёс усялякай рэвалюцыі, усякай вялікай рэвалюцыі. Такой вялізарнай рэвалюцыяй зьяўляецца і наша рэвалюцыя.

У Леніна вайна ёсьць «одно из слагаемых» у ліку тых фактараў, якія прыводзяць да рэвалюцыі, якія прыносяць пры вядомых абставінах ператварэньне рэвалюцыйнай сітуацыі ў непасрэдную рэвалю

ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ Ў БССР ШПАРКА РАЗЬВІВАЕЦЦА

Дынаміка колькасьці жывёлы ў 1927 г., у параўнаньні з 1916 г., у тысячах галоў дае: коняй рабочых—114,4 проц., кароў—142,7 проц., сьвіней—110,7 проц., авец—184,8 проц.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі і жывёлагадоўля.

(У парадку абмеркаваньня).

Уздым сельскае гаспадаркі Беларусі залежыць ад таго, наколькі ў бліжэйшыя гады здолеем колькасна і якасна разьвіць жывёлагадоўлю. Найбольш вострае пытаньне ўздыму жывёлагадоўлі павінна ставіцца пры сацыялістычнай рэканструкцыі сялянскай гаспадаркі.

Калектыўныя гаспадаркі здолеюць павялічыць прыбытковасьць аб'яднанага імі насельніцтва толькі пры той умове, калі жывёлагадоўля ў гэтых гаспадарках будзе ўзьнята на большую ступень, чымся ў індывідуальнай сялянскай гаспадарцы.

У сапраўднасьці мы маем часта такое становішча, што калектыўныя гаспадаркі ў першыя гады не даюць належнага ўздыму жывёлагадоўлі. Гэта адбываецца таму, што самую арганізацыю калектыўнае гаспадаркі мы часта пачынаем не з таго канца, з якога належыць.

Як у нас адбываецца арганізацыя калгасаў? Звычайна справа пачынаецца з таго, што арганізаваны калгас выдзяляецца з вёскі, і безадкладна прыступаюць да арганізацыі сядзібы, пабудовы жылых будынкаў, аграмаджаньня паляводзтва, і толькі ў самую апошнюю чаргу аграмаджваюць жывёлагадоўлю. Такім чынам, на працягу шэрагу год з моманту арганізацыі калгасу жывёлагадоўля застаецца пакінутай галінай у калгасе. Насельніцтва, занятае абсталяваньнем сядзібы, ня можа ўдзяліць належнае ўвагі самой вытворчасьці. Праўда, праз шэраг год наступае значны ўздым і жывёлаводчай галіны.

Выканаўшае пяцігодкі прымушае шукаць мэтадаў безадкладнага ўздыму жывёлагадоўлі—гэтай галоўнай таварнай галіны ў сельскай гаспадарцы БССР.

Вось чаму мэтады арганізацыі калектыўнае гаспадаркі павінны быць больш прыстасаваны да эканомікі БССР. Начатковыя формы калектыўнае гаспадаркі павінны перш за ўсё забясьпечыць арганізацыю жывёлагадоўлі ў вялікім маштабе,—мы самую калектывізацыю павінны пачаць з арганізацыі аграмаджанай жывёлагадоўлі.

Не таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі, а таварыствы па супольным вядзеньні жывёлагадоўлі павінны зьявіцца першай стадыяй калектывізацыі сельскае гаспадаркі ў большасьці раёнаў.

Першым этапам аграмаджаньня ў арганізаваным калгасе павінна зьявіцца арганізацыя жывёлагадоўлі ў буйным маштабе (малочныя стады, сьвіны завод, бэконны множнік, птушніцкі завод і інш.). І толькі пасьля таго, як арганізаваны ўсе вытворчыя галіны, арганізацыя калгасу павінна закончыцца пабудовай усяе сядзібы, узьвядзеньнем жылых будынкаў.

Такі мэтад арганізацыі калгасу павінен ужывацца ўсё больш і больш у БССР, бо ў ім закладзены найбольш спрыяючыя ўмовы для калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Цэйтлін.

ЧЫРВОНА-БЕЛАРУСКАЕ БЫДЛА.

На абшарах Менскай акругі ў Самахвалаўскім раёне знаходзіцца асобая парода буйнай рагатай жывёлы пад назваю чырвона-беларускага быдла.

Яшчэ ў 1922 годзе Наркамзем, улічваючы вялізарную ролю, якую павінна адыграць жывёла ў адбудове нашай с.-г., зьвярнуў увагу на гэту пароду чырвона-беларускага быдла, як на пароду, якая пачала занаць важнае ядра гэтай пароды шляхам пашырэньня племгаспадарак і павялічэньне ў іх ліку жывёлы, выяўленьня прадукцыйнасьці і палепшаньня ўтрыманьня сялянскіх кароў шляхам утварэньня кантрольных т-ваў, распаўсюджваньня чырвона-беларускага быдла праз утварэньне сеткі дзяржаўных злучных пунктаў, утварэньня саюзу заводчыкаў чырвона-беларускага быдла і заключэньня ўмоў на гадоўлю вытворнікаў.

ЦЯЛЯТЫ ЧЫРВОНА-БЕЛАРУСКАЙ ПАРОДЫ.

Павялічэньне асноўнага ядра заключалася ў тым, што да гэтага часу, апрача гаспадаркі „Калініна"—асноўнае ядро чырвона-беларускага быдла—да 1922 г. мела ўсяго каля 12 кароў і 3-4 бугаёў, якія засталіся ад былога абшарніка гэтай гаспадаркі.

Каб выявіць наліччa чырвона-беларускага быдла, у 1923 годзе ў мяст. Самахвалавічы была арганізавана першая выстаўка чырвона-беларускага быдла. Выстаўка паказала, што, апрача племянной гаспадаркі «Калініна», ёсьць яшчэ значная частка гэтага быдла і ў вакольнага насельніцтва. Усяго на выстаўцы было 75 кароў і 6 бугаёў.

Вось з гэтых астаткаў і пачала стварацца мясцовая чырвона-беларуская парода.

Галоўнымі мерапрыёмствамі ў галіне працы над чырвона-беларускім быдлам былі наступныя: павялічэньне асноўнага ўзросту, і наглад за правільным утрыманьнем і скарыстаньнем злучпунктаў.

За час існаваньня саюзам была праведзена першая праца па кантрактацыі маладняка да 1½ г. узросту. Апрача гадоўлі маладняка, ім была праведзена значная праца і па збыту маладняка сваіх сяброў.

У сучасны момант, у зьвязку з рэарганізацыяй малочных арцеляў у малочна-жывёлагадоўчыя т-вы, саюз спыніў сваю працу, перадаўшы свае функцыі малочна-жывёлагадоўчым т-вам Самахвалаўскага раёну і акруговаму малочна-жывёлагадоўчаму саюзу.

Трэба спадзявацца, што дыспут па жывёлагадоўлі, які мае адбыцца ў хуткім часе, дапаможа адшукаць цьвёрдыя шляхі да далейшага разьвіцьця гэтай пароды, што дасьць магчымасьць у больш хуткім часе належна паставіць нашу жывёлагадоўлю.

Вардомскі.

Сьвінагадоўля ў БССР.

Сельская гаспадарка Беларусі ў сыстэме Савецкага Саюзу выдзяляецца сваёй пераважнай спэцыялізацыяй у напрамку жывёлагадоўлі. Гэтаму спасобнічала блізкасьць яе да заходняэўрапейскага рынку і мяйсцовая рынчная кан'юктура, а таксама і наступовае ўзмацненьне кармовай базы, якая па данных ЦСК, за час з 1887 году па 1917 г., выявілася ў павялічэньні плошчы натуральных сенажацяў на 6,7 проц., выганаў на 1 проц., пасеўных траў на 4,1 проц. і бульбы на 2,8 проц., з адначасовым зьніжэньнем у палявым засеве зернавых культур.

Працэс спэцыялізацыі, а разам з ім і інтэнсыфікацыі сельскае гаспадаркі БССР, у жывёлаводным кірунку пачаўся яшчэ ў даваенны час, прыкладна з 90-х гадоў мінулага стагодзьдзя і ішоў шляхам пераважнага разьвіцьця больш інтэнсыўных відаў жывёлы—малочнай і сьвінаводзтва. Так за пярыяд з 1883 г. па 1913 г. стада буйнай рагатай жывёлы ўзрасло на 62 проц., сьвіней на 56 проц., коняй на 29 проц. і авечак на 30 проц.

У Беларусі мы назіраем супольнае разьвіцьцё сьвінагадоўлі і малочнай жывёлы.

З пункту погляду народна-гаспадарчай вартасьці гэту тэндэнцыю ў разьвіцьці жывёлагадоўлі, бязумоўна, трэба лічыць зьявішчам прагрэсыўнага зьместу, таму, што карова зьяўляецца машынай па вырабу малака, з найвышэйшым каэфіцыэнтам карыснай дзейнасьці; сьвіньня, як вытворніца мяса і сала, займае першае мейсца ў параўнаньні з іншымі відамі хатняй жывёлы.

З даных амэрыканскай літаратуры, вядома, што на 1 адзінку прыросту сьвіньні добрага гатунку патрабуецца 4-5 адзінак сухой матэрыі корму, тады, як на адкарм вала трэба 10-12 адзінак, гэта знача, што для вырабу сьвініны патрэбна ў 2,7 раза менш спажыўнай матэрыі, чым для вырабу ялавічыны.

Вельмі карысная здольнасьць сьвіней да перапрацоўкі ў мяса адкідаў сельскае гаспадаркі, у тым ліку малочных, мынавых і інш., якія ня маюць амаль што ніякай рынчнай вартасьці, а таксама высокая якасьць сьвінога мяса, як харчавога прадукту, пры нязначнасьці затрат на арганізацыю і вядзеньне сьвінагадоўлі і хуткасьці звароту укладаемых сродкаў, высоўвае сьвінагадоўлю на першае месца, як адну з карысьнейшых галін сельскае гаспадаркі.

Зварачваемасьць капіталаў у данай галіне) мы ўжо зьвярталі ўвагу і на другое, гэта вельмі чулае рэагаваньне на зьмены эканамічных і гаспадарчых умоў.

Пад уплывам зьніжэньня цэн на сьвініну ці недароду кармоў—сьвінаводзтва ў адзін год можа даць вельмі значнае скарачэньне.

Апошняе сьцьвярджаецца данымі дынамікі сьвінога стада па Цэнтральна-Чарназёмнай Вобласьці, дзе сьвіное стада з 1.457,8 тысяч галоў у 1924 г. зьнізілася да 487,6 тыс. галоў у 1925 г., гэта знача амаль што ў тры разы. І, наадварот, пад уплывам спрыяючай кан'юнктуры на працягу году сьвінаводзтва павялічвалася таксама больш, чым у два разы (з 487,6 тысяч галоў ў 1925 г. да 1.135,3 тыс. галоў у 1926 г).

Разглядаючы дынаміку сьвінога стада на Беларусі, мы павінны адзначыць высокую і ўстойлівую шчыльнасьць сьвінога стада, як у мінулы, так і цяперашні час, якая гаворыць за наяўнасьць умоў, спрыяючых разьвіцьцю сьвінагадоўлі і, страхуючых яе ад такіх колькасных зьмен, як гэта мы назіралі па Цэнтральна-Чорназёмнай вобласьці.

Толькі за час вайны і рэвалюцыі адбылося колькаснае зьніжэньне сьвіней, але з 1923 г. пачынаецца аднаўленчы працэс сьвінога статку, які ідзе хуткім тэмпам, і к 1925 г. дасягае лічбаў 1916 г.

У 1927 годзе сьвіное стада перавышае лічбу 1916 году на 29 проц., прычым дарослыя сьвіньні далі рост толькі 6,7 проц., парасяты—28,7 і надсьвінкі далі прырост на 81,3 проц.

Прыведзеныя даныя даюць падставу сказаць, што сельская гаспадарка Беларусі, асабліва за апошнія гады, стала на шлях падвышэньня таварнасьці сьвінагадоўлі праз паступовы пераход ад экстэнсыўнай (сальнай) формы яго вядзеньня да больш інтэнсыўнай (паўсальнай).

Апрача натуральна-гістарычных умоў якія спрылялі інтэнсыфікацыі сьвінагадоўлі ў БССР, праз ператварэньне яе з сальнае ў паўсальную мы павінны адзначыць і наяўнасьць рынку збыту, які стала прад'яўляў спрос на паўсальную сьвініну. Гэтымі рынкамі, з замежных, у свой час зьяўляліся Польшча і Нямеччына, а з унутраных—Ленінград. І цяпер шлях далейшае інтэнсыфікацыі сьвінагадоўлі—ператварэньне яе з сальнае і паўсальнае ў мясную (бэконную) зьвязан з арганізацыяй сталага рынку збыту на пра-

Мэтад працы дзяржаўных племянных гаспадарак.

Мясцовае быдла, якое распаўсюджана на тэрыторыі БССР і якое знаходзіцца ў вельмі дрэнных умовах харчаваньня і ўтрыманьня, здольна пры палепшаньні гэтых умоў падвышаць колькасна і якасна сваю прадукцыйнасьць.

Пры ўдалым прыліцьці гэтаму быдлу крыві адпаведных культурных парод яно вельмі значна паляпшаецца.

Асяродкам разьвядзеньня чырвона-беларускага быдла зьяўляецца дзяржпагрупа, у склад якой уваходзяць гаспадаркі—„Калініна" э ф. „Зосіна", „Русінавічы" э ф. «Марыумпаль», «Самузлева» і „Сеньніца". Група ўладае зямельнай плошчаю ў 2155 гэктараў, якіх пахаці 1314 і сенажаці 473. Трэба адзначыць, што амаль уся сенажаць забалочана і дае кевялікія ўраджаі. З 1928 г. прыступлена да іх меліярацыі, што будзе закончана на працягу 2-3 гадоў.

Раней племгаспадаркі зусім ня мелі плятнікаў і ўся жывёла ўтрымлівалася на гноі. Зараз адбудован адзін новы плятнік на 90 галоў, капітальна адрамантаваны да выграбнога ўтрыманьня 2 скотныя двары на 170 галоў, пабудована бэтонная гнаявальня, будуюцца дзьве сіласныя вежы і інш.

Яшчэ ня ўсе племгаспадаркі поўнасьцю насычаны беларускім чырвоным быдлам. Зараз у гаспадарках чырв.-беларускага быдла налічваецца: быкоў-вытворнікаў—8, кароў—190, быкоў 1-2 гадоў—20 і маладняка—114 галоў. Трэба адзначыць, што ў пачатку рэвалюцыі абшарнік забраў з Ігнаціч у Польшчу амаль усё стада чырвонага беларускага быдла.

У 1927-28 г. сярэдні гадавы ўдой кароў даў 2168 літр., пры 4 проц. тлустасьці малака (максымальная асобных кароў дасягае 7,5 проц.).

На мэтад гнездавой заводзкай працы звернута вялікая ўвага, і ў наступным пяцігодзьдзі НКЗем намеціў арганізаваць цэлы шэраг племгаспадарак, якія апрача вядзеньня гнездавой заводзкай працы, павінны будуць снабжаць савгасы і калгасы стандартнымі заводзкімі вытворнікамі.

Д. Сьвідэрскі.

Жарабок „Арэн", 4-х год, селяніна Кананова (вёска Краснае, Магілеўскага раёну).

Жарабок дзяржаўнай стайні. (Племянная гаспадарка Самузлева).

Роля жывёлагадоўлі ў сельскай гаспадарцы БССР.

Значэньне жывёлагадоўлі можна характарызаваць тэй удзельнай вагой, якую займае яна ў сельскай гаспадарцы. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што прадукцыя сельскае гаспадаркі БССР складае (даныя 27-28 г.) 77,1 проц. ад усей прадукцыі народнай гаспадаркі. Адсюль зразумела, што разьвіцьцё адной з буйнейшых галін сельскае гаспадаркі—жывёлагадоўлі будзе адбівацца на становішчы ўсяе народнае гаспадаркі і ў тым большай ступені, чым большую вагу мае галіна ў сельскай гаспадарцы.

Калі возьмем кошт капіталаў сельскае гаспадаркі на пачатак году па бюджэтах сялянскіх гаспадарак за 1925-26 год, дык капітал у жывёле і птушках складае ў сярэднім на 1 гаспадарку 346,94 руб. ці 36,5 проц. Калі-ж улічыць прыкладна 50 проц. усяго кошту с.-г. будынкаў і аднесьці іх на жывёлагадоўлю, дык тады асноўны капітал, які зьвязаны з наяўнасьцю жывёлагадоўлі ў гаспадарцы, складзе прыблізна 459,5 руб. ці 48,4 проц. ад усяго кошту асноўных капіталаў сялянскае гаспадаркі.

Жывёлагадоўля мае вялікае значэньне ў сэнсе вытворчага скарыстаньня таго запасу рабочага часу, які ёсьць у сялянскай гаспадарцы. На бюджэтах сялянскіх гаспадарак гэта скарыстаньне даходзіць да 17,7 проц. усяго запасу часу (уключаючы і сьвяты), 29,3 проц. ад усяго часу і 52,1 проц. усяго часу, які скарыстоўваецца на сельскую гаспадарку.

Згодна папярэдняга балянсу 1927-1928 г., жывёлагадоўля складае 40,8 проц. ад усяе прадукцыі сельскае гаспадаркі. Яшчэ большая роля жывёлагадоўлі ў таварнай масе сельскае гаспадаркі. Тут удзельная вага жывёлагадоўлі значна вышэй, чым у прадукцыі, прычым з працягам яна значна павялічваецца. Так, у 1925-26 г. яна складае 45,9 проц., у 1926-27 г.—52,7 проц., а ў 1927-28 г. яна ўжо даходзіць да 59,7 проц. ад усёй таварнай масы сельскай гаспадаркі. Дзякуючы гэтаму, троцяя частка ўсіх грашовых даходаў сялянскае гаспадаркі атрымліваецца ад жывёлагадоўлі. Калі-ж мы возьмем грашовы даход толькі ад продажу прадуктаў сельскае гаспадаркі, дык у гэтым даходзе жывёлагадоўля займае 67,9 проц.

У галіне экспарту прадукты жывёлагадоўлі займаюць таксама значнае месца і складаюць за апошнія тры гады каля 60 проц. экспарту с.-г. прадуктаў і каля 30 проц. ад агульнае сумы ўсяго экспарту.

Акрамя гэтага, трэба адзначыць вялікае значэньне жывёлагадоўлі, як фабрыкі для пераапрацоўкі адкідаў ад паляводзтва (саломы, мякіны), а таксама гародніцтва, як фабрыкі для пераапрацоўкі прадуктаў лугаводзтва.

Трэба яшчэ ўлічыць, што жывёлагадоўля зьяўляецца галоўнай крыніцай цягавае сілы ў сельскай гаспадарцы, а таксама тое, што адкіды жывёлагадоўлі ў выглядзе гною зьяўляюцца асноўным фактарам падтрыманьня і павялічэньня ўраджайнасьці нашых палёў.

Выходзячы са ўсяго гэтага, зусім зразумела, што павінны быць ужыты ўсе захады дзеля належнага разьвіцьця гэтай буйнейшай галіны сельскае гаспадаркі.

Між тым буйнаму росту жывёлагадоўлі ў пасьляваенныя часы не адпавядаў рост кармавое базы, з прычыны чаго ўжо ў мінулым годзе рост стада спыніўся.

Рыначныя ўмовы дзеля прадуктаў жывёлагадоўлі таксама пагоршыліся ў тым сэнсе, што за адну і тую-ж адзінку прадуктаў жывёлагадоўлі ў даны момант можна купіць менш кармавых адзінак, чымся ў 1913 г. і ў папярэднія пасьляваенныя гады.

Зразумела, што ўтварыць кармавую базу можна ў максымальнай ступені толькі ў буйных гаспадарках—калгасах і савгасах. Наблізіць да сябе рынак шляхам утварэньня прадпрыёмстваў для пераапрацоўкі прадуктаў сельскае гаспадаркі наогул і прадуктаў жывёлагадоўлі ў прыватнасьці лягчэй таксама буйным гаспадаркам, а таму побач з павялічэньнем колькасці і разьвіцьця гэтых гаспадарак будзе ісьці і разьвіцьцё жывёлагадоўлі.

Я. К.



Бугай „Лабат"—чырвона-беларускай пароды.

Неабходна адзначыць, што на колькасьці сьвінога стада БССР, у параўнаньні з іншымі раёнамі Саюзу, стаіць на першым месцы і ідзе наперадзе некаторых замежных дзяржаў.

Трэба памятаць, што сьвінагадоўля адрозьніваецца ад іншых галін сельскае гаспадаркі некаторымі арганізацыйнымі асаблівасьцямі. На адну з іх (хуткая дукты сьвінгадоўлі данага тыпу. Апошні элемэнт будзе уносіцца індустрыялізацыяй гэтай галіны, а менавіта праз будаўніцтва бэконных фабрык, якія забясьпечаць сталы попыт на бэконных (мясных) сьвіней і пераапрацоўку гэтага сыр'я ў найбольш выгадных формах для збыту на замежны рынак.

Жыркевіч.

НА ШЛЯХУ ДА ШЫРОКАГА РАЗЬВІЦЬЦЯ.

Рост буйнай жывёлы.

Сельская гаспадарка БССР у сыстэме савецкага Саюзу вызначаецца адносна высокім зьвітай жывёлагадоўляй. Так, па данных за 1926 год шчыльнасьць жывёлы на 100 дзесяцін пасеву ў асобных частках Саюзу была: агулам у УССР—82,9, РСФСР—89,0, УССР—89,0 і ў БССР—108,6.

Жывёлагадоўля ў сельскай гаспадарцы Беларусі зьяўляецца галоўнай галінай гаспадаркі: палова ўсей прадукцыі ад сельскай гаспадаркі складае прадукцыя жывёлагадоўлі.

Удзельная вага жывёлагадоўлі ў сельскай гаспадарцы характарызуецца наступнымі данымі (прадукцыя жывёлагадоўлі ў процантах да прадукцыі всей сельскай гаспадаркі): у 1925-26 годзе валавая прадукцыя была 37,7 проц., таварная маса—43,1 проц.: у 1926-27 г валавая прадукцыя 37,4 проц., таварная маса—49,5 проц. і ў 1927-28 г. валавая прадукцыя жывёлагадоўлі ад усёй прадукцыі сельскае гаспадаркі складае 39,0 проц., а таварная маса 57,1 проц., што перавышае палову ўсёй таварнай масы сельскай гаспадаркі Беларусі (папярэднія даныя за 1927-28 г.).

Дынаміка калькасьці жывёлы ў тыс. галоў характарызуецца ніжэйнаступнымі данымі: коні рабочыя—746,8, 1927—854,0—у процантах да 1916 г.—114,4 проц.; каровы—936,7, 1927—1336,0 у працантах да 1916 г.—142,7 проц.; быкі—21,7, 1927 г.—31,0 у працантах да 1916 г.—110,6 проц.; сьвіньні дарослыя—729,7, у 1927 годзе—778,6 у процантах да 1916 г. 110,7 проц. і оўцы ўсяго ў 1916 годзе—1744,9, у 1927 г.—3224,5—у процантах да 16 году 184,8 проц.

Пачынаючы з 1924 году жывёлагадоўля ў БССР характарызуецца штогадовым пашырэньнем стада і ў 1927 г. яно значна правысіла разьмеры 1916 году.

Побач з колькасным ростам жывёлагадоўлі, асабліва малочнага быдла, разьвіваецца малочная каапэрацыя і ўзмацняецца жывёлагадоўля ў калгасах і савгасах.

Кармовае пытаньне.

Кармовае пытаньне ў умовах БССР зьяўляецца адным з самых нявывучаных. Досыць сказаць, што ў апараце НКЗ няма ніводнага спэцыяліста, які вёў-бы прапрацоўку гэтага пытаньня і ўвязкаў мерапрыёмстваў у галіне жывёлагадоўлі з мерапрыёмствамі паляводзтва, культуры балот і сенажацяў.

Пры пераліку колькасьці жывёлы на ўзятыя нормы гадавога кармленьня мы атрымаем наступныя лічбы патрэбных кармоў і недахопу ў іх пры параўнаньні з наяўнасьцю кармоў у тысячах тон:

Сена: 1928-29 г. патрэбна 5200, ёсьць 3971,1, нехапае 30,8 проц.

Саломы і мякіны ў кори і надсьцілку ў 1928-29 г. патрэбна—2900,8, ёсьць—1969,1, не хапае—42,2 проц.

Сакавітыя кармы—у 1928-29 г. патрэбна 2132,1, ёсьць 2072,7, не хапае 2,1 проц.

Моцныя кармы: у 1928-29 г. патрэбна 1138,6, ёсьць 582,0, недахоп 95 проц.

З прыведзенага відаць, што для забясьпечаньня неабходнага зоотэхнічнага мінімуму кармленьня жывёлы мы маем вялікі недахоп кармоў.

На бліжэйшае пяцігодзьдзе, згодна пэрспэктыўнага пляну, прадугледжваюцца наступныя мерапрыёмствы мэліяратыйна-культур-тэхнічнага і агранамічнага характару:

а) Павярховае палепшаньне асушаемых плошчаў—255.000 гэкт. і грунтоўнае—да 105.000 гэкт.

б) Павярховае палепшаньне натуральных сухадольных і заліўных сенажацяў на плошчы каля 700.000 гэкт. якое будзе праведзена ў парадку аграмінімуму. Апошняя плошча складае 50 проц. ад усей плошчы натуральных сенажацяў.

в) Пашырэньне плошчы пад бульбай і кармавымі карняплодамі да 455.900 гэкт. Прычым плошчы карняплодаў па савгасах і калгасах павінны быць даведзены да поўнага здавальненьня запатрабаваньня гаспадаркі ў гэтых кармох.

г) Мяркуецца правесьці масавае выдзяленьне плошчаў пад штучныя выпасы з іх далейшай культывіроўкай.

д) Плошчы насеньнікаў траў і корнеплодаў у савгасах і калгасах у бліжэйшыя 2 гады павінны быць даведзены да поўнага здавальненьня ўласных запатрабаваньняў і водпуску на рынак 100 проц. ад гэтай колькасьці.

Племянная справа.

Становішча племянной справы ў жывёлагадоўлі БССР характарызуецца тым напрамкам, які абраны для паасобных відаў жывёлы, а таксама наліччам племяннога палепшанага матар'ялу, галоўным чынам, вытворнікаў.

У падвышэньні якасьці жывёлы рашучую ролю адыгрывае наліччa высокаякасных вытворнікаў, якія складаюць сетку злучных пунктаў. Рост ухваленых вытворнікаў па відах жывёлы ў 1932-33 г. будзе наступны: жарабкоў ухваленых у 1928-29 г.—2320, у 1932-33 г.—5000; кныроў ухваленых—у 1928-29 г.—933, у 1932-33 г.—11400; бараноў ухваленых—у 1928-29 г.—429, у 1932-33 г.—3000.

Грунтоўнымі базамі разьвіцьця племянной справы павінны зьявіцца племгасы, савгасы і калгасы, прадукцыя якіх будзе накіравана як на папаўненьне сваіх стад, гэтак і для здавальненьня запатрабаваньняў ў каапэраванага і рэшты насельніцтва ў племянным матар'яле.

Якасны склад буйнай рагатай жывёлы ў БССР вельмі нізкі. Жывая вага каровы—18 пудоў. Сярэдні гадавы ўдой—57 пудоў і каля 10 проц. ялавасьці—сьведчыць аб неабходнасьці мерапрыёмстваў, садзейнічаючых як зьніжэньню процанту ялавасьці, так і падвышэньню прадукцыйнасьці жывёлы.

У аснову ўсіх мерапрыёмстваў па падняцьцю прадукцыйнасьці жывёлы кладзецца гнездавы мэтад працы.

На бліжэйшае пяцігодзьдзе мяркуецца племянную групу па гадоўлі буйнай рагатай жывёлы пашырыць з 3-х да 11 гаспадарак, у якіх будзе кароў—у 1928-29 г.—641, у 1932-33 г.—1740.

Дзеля фарсыраваньня папаўненьня стада савгасаў і калгасаў мяркуецца разгарнуць працу па кантрактацыі цялят, у 1929-30 г. будзе закантрактавана—бычкоў 6500, цёлак 15000 і ў 1932-33 г. 10000 бычкоў і 50000 цёлак.

Якаснае становішча **каняводзтва** ў БССР характарызуецца тым, што большасьць коняй ніжэй 2-х аршын росту і маюць 15—25 пудоў жывой вагі.

Праведзенае выбарачнае абсьледваньне каняводзтва гаворыць аб неабходнасьці палепшаньня мясцовага каня. Колькасьць ухваленых жарабкоў за апошнія гады складае 3,7 проц. агульнага складу жарабкоў. Падвышэньне гэтага процанту і магчымае папаўненьне конскага пагалоўя палепшаючымі жарабкамі зьяўляецца асноўнай задачай каняводзтва. Крыніцамі атрыманьня жарабкоў для палепшаньня пароды мясцовых коняй будзе Дзяржконзавод, Дзяржстайня, завоз з РСФСР і палепшаныя сялянскія.

Існуючы Дзяржконзавод у 65 матак будзе папыран да 1932-33 г. да 100 матак.

Памянёны племматар'ял пойдзе: маткі для папаўненьня конзаводу, а жарабкі—па Дзяржстайню, у савгасы і калгасы для арганізацыі злучных пунктаў.

Для пашырэньня Дзяржконзаводу адводзіцца савгас „Шэрсьцін", Гомельскай акр.

Разьвіцьцё **сьвінагадоўлі** ў бліжэйшае пяцігодзьдзе будзе накіравана ў бок павялічэньня таварнасьці яго і арганізацыі збыту прадуктаў у найбольш выгаднай форме.

Падняцьце якасьці мясцовай палепшанай сьвіньні будзе ісьці шляхам мэтызацыі яе з крупнай белай ангельскай, палепшаньня кармленьня, утрыманьня і забясьпячэньня арганізаванага збыту. Усе мерапрыёмствы мяркуецца праводзіць па прынцыпу поўнай канцэнтрацыі іх у намячаемых да бэканізацыі раёнах (Менская, Бабруйская, Магілеўская, Віцебская акругі).

Птушніцтва яшчэ не дасягнула свайго даваеннага ўзроўню па ўдзелу ў экспарце. Між тым наліччa зернавых адкідаў, вадаёмаў, нязначнасьць затраты капіталаў і хуткасьць звароту іх спрыяюць разьвіцьцю птушніцтва ў БССР, як экспартнай галіне сельскай гаспадаркі.

У бліжэйшае пяцігодзьдзе мяркуецца што ўся праца па птушніцтву будзе накіравана ў бок палепшаньня мясцовай птушкі разьвіцьцём сеці дзяржаўных племянных заводаў, рассадзікаў—множнікаў і птушніцкіх таварыстваў.

Птушына-трусіныя заводы разьлічваюцца на 1500 птушак і 300 кролікаў.

Існуючыя 2 заводы дадуць 4200 шт. маладняку і 1000 яек. У намечаных на 1932-33 г. 4-х заводах мяркуецца атрымаць прадукцыі: маладняку-птушкі 38.600, яек—178.800 шт. і 15.200 галоў кролікаў.

Аўцаводзтва ў Беларусі мае значэньне спажывецкай галіны сельскай гаспадаркі і служыць для здавальненьня мясцовых патрэб насельніцтва ў воўне і часткова ў мясе.

Існуючыя 8 племянных аўчарняў і 8 рассадзікаў выпусьцяць сёлета 200 галоў.

Зоотэхнічная сетка.

Па штату праэктавалася мець зоотэхнічнага пэрсаналу па лініі Наркамзему 118 чалавек, з іх 8 акруговых зоотэхнікаў, 74 раёных і 26 кантроль асыстэнтаў. Фактычна ёсьць акруговых зоотэхнікаў 8, раёных—53, кантроль-асыстэнтаў—25, усяго—86 асоб. Такім чынам, раённая зоотэхнічная сетка не ўкамплектавана на 32 штатныя адзінкі.

Такая забясьпека зямельных органаў спэцыялістамі па жывёлагадоўлі ў зьвязку з тым значэньнем, якое мае жывёлагадоўля ў сельскай гаспадарцы рэспублікі, ні ў якой меры не дае магчымасьці разгарнуць працу па жывёлагадоўлі і забясьпечыць да канца пяцігодкі мяркуемае па пляну каапэраваньне сялянскіх гаспадарак у малочна-жывёлагадоўчую каапэрацыю да 40 проц. ад усёй колькасьці гаспадарак.

Выходзячы з гэтага, зоотэхнічная праца павінна быць пабудавана наступным чынам. У цэнтры—у НКЗ—з асобных функцыяналаў і ветэрынарыі павінна быць утворана самастойная група спэцыялістаў па жывёлагадоўлі.

У акругах пры акруговых зямельных аддзелах да канца 1932-33 году павінна быць па 3 спэцыялісты па жывёлагадоўлі, прычым у некаторых з іх можа быць па 2, а ў больш інтэнсыўных—па 4 асобы.

Раёны ў 1929-30 годзе забясьпечваюцца зоотэхнікамі па 1 на раён, і 5 інструктарамі па сьвінагадоўлі ў раёне аршанскай бэконнай фабрыкі.

Ляховіч.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра закады для ліквідацыі беспрацоўя сярод асоб начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі: звольненых у доўгатэрміновы водпуск, запас і зусім ад службы.

Для ліквідацыі беспрацоўя сярод звольненых з Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў доўгатэрміновы водпуск, запас і зусім ад службы асоб сярэдняга, старшага, вышэйшага і малодшага звыштэрміновай службы начальніцкага складу, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абязвязаць Народны Камісарыят Працы БССР прапанаваць біржам працы пасылаць у першую чаргу перад усімі бяз выключэньня беспрацоўнымі:

а) усіх беспрацоўных асоб начальніцкага складу—сярэдняга, старшага, вышэйшага і малодшага звыштэрміновай службы (апроч асоб, прадугледжаных пастановаю СНК СССР за 14 верасьня 1926 г. „Пра парадак дачы пасад у дзяржаўных установах і прадпрыёмствах асобам начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі звольненых у запас доўгатэрміновы водпуск і зусім ад службы"—(З. З. СССР 1926 г. № 63, арт. 475) незалежна ад часу звальненьня іх з Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі;

б) асоб начальніцкага складу в ліку прадугледжаных паказанаю вышэй пастановаю СНК СССР, якія камісіямі ня могуць быць пасланы на работу ў зьвязку з запаўненьнем трохпроцантнай брані штатных пасад.

2. Асобы начальніцкага складу, якія пасылаюцца на работу, павінны па сваёй кваліфікацыі адпавядаць патрабаваньням наймальнікаў.

3. Пасылаючы на работу асоб начальніцкага складу, біржы працы павінны ўлічваць, каб іх заработак быў, па магчымасьці, ня меншы акладу, які яны атрымлівалі на апошняй пасадзе ў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

4. Асобы начальніцкага складу, якія адмовяцца бяз важных прычын ад работы, на якую іх пасылае біржа працы, а таксама асобы, якія пакінулі службу па свайму жаданьню і звольнены па прычынах, залежных ад іх саміх, пазбаўляюцца льгот, дадзеных гэтаю пастановаю, і ў далейшым пасылаюцца на работу на агульных падставах з іншымі беспрацоўнымі.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Калевіч.**

17 ліпеня 1929 г. г. Менск.

ПАСТАНОВА

ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЫ ПРЫ САВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

ПРА РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ І ДАЧУ ЛЬГОТ ПА АБАВЯЗКОВЫМ АКЛАДНЫМ СТРАХАВАНЬНІ Ў 1929-30 АПЭРАЦЫЙНЫМ ГОДЗЕ.

Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе: рэспубліканскі фонд льгот па абавязковым акладным страхаваньні на 1929-30 г. устаноўлены адпаведна да пастаноў Савету Працы і Абароны за 28 чэрвеня 1929 г. (Изв. ЦК СССР за 5 і 7 ліпеня 1929 г. № 151 і 153).

1. Разьмеркаваць рэспубліканскі фонд льгот па абавязковым акладным страхаваньні па 1929-30 год паміж паасобнымі акругамі наступным парадкам:

№№ па пар.	НАЗВА АКРУГ	Разьмер льготнага фонду ў рублёх.	
		Па сельскім страхаваньні.	Па гарадзкім страхаваньні.
1.	Бабруйская . . .	162.600	4.258
2.	Віцебская . . .	140.200	2.976
3.	Менская . . .	201.200	2.571
4.	Магілеўская . . .	206.500	4.037
5.	Аршанская. . .	144.700	1.623
6.	Гомельская . . .	137.600	3.433
7.	Мазырская. . .	87.500	1.153
8.	Полацкая . . .	96.400	862
	БССР . .	1.176.700	20.913

2. Даручыць акруговым выканаўчым камітэтам у тэрміновым парадку разьмеркаваць акруговыя фонды льгот паміж раёнамі і гарадамі і прыняць захады каб райвыканкомы хутчэй разьмеркавалі раённыя фонды паміж сельскімі і местачковымі саветамі з тым каб дача льгот па прыналежнасьці была скончана: у сельскіх мясцовасьцях і ў мястэчках не пазьней 1-га кастрычніка 1929 году і ў гарадох—да 1-га лістапада 1929 году.

3. Зацьвердзіць даданую да гэтага інструкцыю пра парадак дачы насельніцтву БССР льгот па абавязковым акладным страхаваньні на 1929-30 апэрацыйны год.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Нам. Кіраўніка Спраў СНК і Эканамічнай Нарады БССР **В. Крывіцкі.**

22 ліпеня 1929 г. г. Менск.

ІНСТРУКЦЫЯ

пра парадак дачы насельніцтву БССР льгот па абавязковым акладным страхаваньні ў 1929-30 апэрацыйным г.

I. ПА СЕЛЬСКІМ СТРАХАВАНЬНІ.

§ 1. Фонд ільгот для насельніцтва па абавязковым акладным страхаваньні разьмяркоўваецца паміж райёнамі і гарадамі акруговымі камісіямі па адзіным с.-г. падатку. У склад акруговых падатковых камісій уводзяцца з правам пастаноўчага голасу загадчыкі акруговых страхавых агэнцтваў.

§ 2. Акруговы фонд ільгот павінен разьмяркоўвацца паміж райёнамі ў залежнасьці ад эканамічнага становішча сялянскіх гаспадарак з тым, каб ва ўсіх райёнах бяднейшае насельніцтва было аднолькава ахоплена ільготамі.

§ 3. Райённы фонд ільгот разьмяркоўваецца арыентыровачна паміж сельскімі і местачковымі саветамі райённымі падатковымі камісіямі, з удзелам у іх раённых страхавых агэнтаў з правам пастаноўчага голасу.

§ 4. Раённыя камісіі, пры разьмеркаваньні фонду ільгот, выдзяляюць рэзэрв з сумы агульнага фонду ільгот, неабходны для здавальненьня ільготамі сем'яў чырвонаармейцаў і чырвонафлётцаў, члены якіх будуць узяты ў шэрагі Чырвонай арміі альбо Чырвонага флёту ўвосень 1929 г.

§ 5. Пастановы падатковых камісій пра разьмеркаваньне фонду ільгот зацьвярджаюцца: у акругах—прэзыдыумамі акруговых выканаўчых камітэтаў, а ў раёнах—прэзыдыумамі раённых выканаўчых камітэтаў.

§ 6. Ільготы асобным страхавацелям даюцца сельскімі ці местачковымі саветамі сумесна з камітэтамі таварыстваў узаемадапамогі, альбо сельскімі ці местачковымі фінансава-падатковымі камісіямі там, дзе яны існуюць.

§ 7. За рахунак устаноўленага для сельскага ці местачковага савету фонду ільгот у першую чаргу вызваляюцца ад выплаты страхавых плацяжоў:

а) усе тыя гаспадаркі, па якіх налічана акладных страхавых плацяжоў ня больш 50 кап., за выключэньнем налічанага акладу на будынкі сумеснага ўладаньня, як-та: сумесныя хаты, авіны, лазьні і г. д;

б) сем'і асоб, узятых у Чырвоную армію і Чырвоны флёт, былыя чырвоныя партызаны і іх сем'і і сем'і асоб, якія былі ўзяты ў якасьці заложнікаў і расстрэляных белапалякамі, інваліды вайны і працы, аднесяныя да першай, другой і трэцяй катэгорыі інваліднасьці,—абавязкова ў разьмеры аднэй трэцяй часткі акладу, налічанага на гэтыя гаспадаркі па ўсіх відах акладнога страхаваньня, за выключэньнем тых гаспадарак, якія індывідуальна абкладзены сельска-гаспадарчым падаткам, або залічаны ў катэгорыю яўна кулацкіх гаспадарак;

в) дабравольныя пажарныя арганізацыі, якія існуюць на падставе зацьверджаных у законным парадку статутаў;

г) грамадзкія пасевы, прызначаныя для ўтварэньня непарушных запасаў насеньня і зробленыя сродкамі грамады на зямлі, выдзеленай з грамадзкага фонду, калі пастановы аб гэтым зарэгістраваны ў акруговым зямельным аддзеле;

д) камітэты сялянскай узаемадапамогі па страхаваньню іх уласнай маемасьці, якая скарыстоўваецца імі для ажыцьцяўленьня сваіх задач, за выключэньнем прамысловых прадпрыёмстваў;

е) калектыўныя гаспадаркі (камуны і арцелі) у такіх-жа самых разьмерах, як і па сельска-гаспадарчаму падатку (§§ 175, 176, 209 інструкцыі НКФ БССР пра парадак правядзеньня адзінага сельска-гаспадарчага падатку ў 1929-30 г.).

ж) гаспадаркі, якія накрылі ў 1927-28 і 1928-29 г. г. агнятрывалымі дахамі свае будынкі—у разьмеры 50 проц. акладу, прыпадаючага на гэтыя будынкі.

Увага 1: Да асоб, узятых у шэрагі Чырвонай арміі і Чырвонага флёту ў тым ліку войск ДПУ і канвойнай варты, на сем'і якіх пашыраюцца ільготы па абавязковым акладным страхаваньні, належаць: а) вайскоўцы кадравага радавога і малодшага начальніцкага складу, якія знаходзяцца на бесперапыннай (тэрміновай) або звыштэрміновай службе, уключаючы сюды і тых, якія прызваны ўвосень 1929 г.; б) вайскоўцы сярэдняга, старшага і вышэйшага начальніцкага складу, якія знаходзяцца на кадравай службе, або ў рэзэрве; в) паказаныя ў літ. „а" і „б" асобы, якія звольнены ад абавязковай службы ў кадравым складзе Чырвонай арміі і Чырвоным флёце ў доўгатэрміновы водпуск, у запас, альбо зусім ад службы пасьля 1-га сакавіка 1929 г., г) асобы начальніцкага складу (сярэдняга, старшага і вышэйшага) узятыя ў якасьці інструктароў для правядзеньня дапрызыўнай і пазавайсковай падрыхтоўкі і на вучэбныя зборы, калі яны лічацца ў пераменным складзе тэрытарыяльных часьцей, у доўгатэрміновым водпуску і ў запасе Чырвонай арміі; д) вайскоўцы малодшага каманднага складу, якія пералічаны з доўгатэрміновага водпуску ў пераменны склад тэрытарыяльных часьцей, у выпадку іх прызыву на вучэбныя зборы.

Знаходжэньне члена сям'і на вайсковай службе правяраецца па дакумантах фінансавых частак раённых выканаўчых камітэтаў.

Увага 2: Калі сем'і чырвонаармейцаў і чырвонафлётцаў, былыя чырвоныя партызаны і іх сем'і або сем'і члены якіх былі расстрэляны белапалякамі ў якасьці заложнікаў, інваліды вайны і працы 1, 2 і 3 катэгорыяў уваходзяць у склад калянктыўных гаспадарак (арцеляў і камун) і апроч аграмаджанай гаспадаркі, яшчэ маюць свае ўласныя гаспадаркі, дык ільгота даецца па ўласнай гаспадарцы ў агульным парадку, а камуне ці арцелі даецца ільгота, паказаная ў пункце „е" гэтага параграфу.

Увага 3. Сем'і чырвонаармейцаў і чырвонафлётцаў, былых чырвоных партызан і растрэляных белапалякамі заложнікаў, маюць права толькі на ільготы па акладу. Нядзеімкі мінулага году ў парадку памянёных ільгот ня зьнімаюцца.

Увага 4: Калі сем'ям чырвонармейцаў і чырвонафлётцаў, былым чырвоным партызанам і іх сем'ям і сем'ям растрэляных белапалякамі заложнікаў інвалідаў вайны і працы 1 2 і 3 катэгорыі па стану іх гаспадарак, ільготам належыць у большым разьмеры, чым паказана ў пункце „б" гэтага параграфу, альбо гэтыя гаспадаркі павінны быць вызвалены ад выплаты ўсіх акладных страхавых плацяжоў на падставе ільгот бяднейшаму насельніцтву, то ў такіх выпадках яны атрымоўваюць большую ільготу.

§ 8. Пасьля задаваленьня ільготамі гаспадарак, паказаных у § 7 гэтай інструкцыі, вызваляюцца ад поўнай выплаты акладу бяднацкія гаспадаркі, якія вызвалены ад с.-г. падатку па неабкладаемаму мінімуму.

§ 9. Рэшта ільгот, якая застаецца пасьля задаваленьня гаспадарак, паказаных у §§ 7 і 8 гэтай інструкцыі, разьмяркоўваецца паміж:

а) маламоцнымі гаспадаркамі, а таксама гаспадаркамі, зруйнаванымі навальнымі бядотамі (пажар, градабіцьце, вымачкі, вымаразкі, гураган, разводзьдзе, поўная ці частковая гібель пасеваў або сенажаці, паморак на жывёлу і крадёж жывёлы);

б) перасяленцамі і расьсяленцамі, якія перасяляюцца і расьсяляюцца паводле правілаў аб землеўпарадкаваньні і перасяленьні на новыя мейсцы, калі гэтымі гаспадаркамі ў працягу з 1-га ліпеня 1928 г. да 1-га ліпеня 1929 году пабудаваны на нова адведзеных мяйсцох будынкі, патрэбныя для сталага вядзеньня гаспадаркі;

в) эмігрантамі і рээмігрантамі, якія вядуць сельскую гаспадарку сваею працаю;

г) цыганамі, якія перайшлі на сталае працоўнае жыцьцё, калі яны фактычна пасяляліся на землі з належнага дазволу зямельных органаў не раней 1-га студзеня 1926 году і

д) працоўным яўрэям, якія перасяляліся або расьсяляліся ў парадку правілаў аб земляўпарадкаваньні і расьсяляньні.

Увага: Ільготы гаспадаркам, пералічаным у літ. „г" і „д" гэтага параграфу, даюцца незалежна ад пабудаваньня будынкаў на мясцох новага пасяленьня.

§ 10. З пералічаных у § 9 гэтай інструкцыі гаспадарак і асоб ільготы даюцца толькі тым, правы якіх на атрыманьне ільгот будуць прызнаны сельскімі ці местачковымі камісіямі (гл. § 6 інструкцыі) у залежнасьці ад іх беднасьці і стану гаспадаркі.

Памянёныя гаспадаркі могуць вызваляцца ад выплаты акладных страхавых плацяжоў цалкам ці часткова, але ня менш чым на адну трэць.

§ 11. Калі за пералічанымі ў §§ 8 і 9 гаспадаркамі, якія будуць вызвалены ад выплаты акладу за 1929-30 г., лічыцца нядоімка страхавых плацяжоў, дык апошняя зьмяншаецца ў тэй самай частцы або процанце, як і аклад (цалкам ці часткова).

Зьнятая разам з акладам нядоімка залічваецца ў агульны фонд ільгот.

§ 12. Пры вызваленьні асобных гаспадарак ад выплаты акладных страхавых плацяжоў, сельскія і местачковыя камісіі павінны кіравацца адпаведнымі сьпісамі гаспадарак, якія вызвалены ад пляцяжу с.-г. падатку па неабкладаемаму мінімуму, маламоцнасьці, а таксама па перасяленьню і расьсяленьню.

§ 13. На вызваленыя ад выплаты страхавых плацяжоў гаспадаркі, сельскімі і местачковымі камісіямі складаюцца сьпісы ў 2-х экзэмплярах, якія пасылаюцца на канчатковае зацьвярджэньне райённай падатковай камісіі не пазьней 1-га верасьня 1929 г.

Пасьля зацьвярджэньня сьпісаў райённай падатковай камісіяй, адзін экзэмпляр сьпісу перадаецца ў страхавое агэнцтва, а другі—зварочваецца сельскаму ці местачковаму савету і вывешваецца да агульнага ведама насельніцтва.

§ 14. Скаргі на постановы сельскіх ці местачковых камісій могуць падавацца ў райённую падатковую камісію на працягу месяца з дню апавяшчэньня сьпісу ў сельскім ці местачковым савеце.

Пастановы райённых падатковых камісій лічацца канчатковымі.

§ 15. Калі будзе страхавая страта ў гаспадарцы, якая вызвалена ў парадку ільгот цалкам ці часткова ад выплаты акладных страхавых плацяжоў, то зьнятая сума ільготы ня ўтрымоўваецца з страхавой узнагароды.

§ 16. Калі страхавальнікі, якім дадзены ільготы, выплацілі страхавыя плацяжы да моманту дачы im ільгот, то лішкі ўнесяных сум зварочваюцца страхавацелю.

II. ПА ГАРАДЗКІМ СТРАХАВАНЬНІ.

§ 17. Ільготы па гарадзкім акладным страхаваньні даюцца: сем'ям чырвонаармейцаў і чырвонафлётцаў, былым чырвоным партызанам і іх сем'ям, сем'ям асоб расстрэляных белапалякамі ў якасьці заложнікаў, інвалідам вайны і працы, дабравольным пажарным арганізацыям, бяднейшым гаспадаркам, а таксама гаспадаркам, зруйнаваным навальнымі бядотамі—у разьмерах, якія прадугледжаны §§ 7, 8, 9, 10, 11, 15 і 16 гэтай інструкцыі.

§ 18. Для вызваленьня ад выплаты акладных страхавых плацяжоў у гарадох складаюцца камісіі з старшыні — прадстаўніка гарадзкога савету і членаў на аднаму ад: камітэту таварыства ўзаемадапамогі аб'яднаньня прафэсыянальных саюзаў, страхавога агэнцтва і інспэкцыі сацыяльнага забесьпячэньня.

§ 19. Сям'ям чырвонаармейцаў і чырвонафлётцаў, былым чырвоным партызанам і іх сем'ям і сем'ям асоб расстрэляных белапалякамі ў якасьці заложнікаў, а таксама дабравольным пажарным арганізацыям ільгота даецца пры зборы плацяжоў.

Іншыя страхавацелі, якія жадаюць атрымаць ільготу, павінны падаваць аб гэтым заяву ў страхавое агэнцтва; тэрмін падачы заяў устанаўляецца гарадзкімі саветамі і абвяшчаецца імі да агульнага ведама.

§ 20. Страхавыя агэнцтвы павінны абавязкова правяраць матар'яльнае становішча асоб, што падалі заявы з хадайніцтвамі аб вызваленьні ад выплаты акладных страхавых плацяжоў. Пасьля праверкі гэтыя заявы з заключэньнем страхавога агэнцтва ідуць на разгляд камісіі (гл. § 18 інструкцыі) (глядзі ўвагу ніжэй.

Скаргі на пастановы камісій падаюцца ў прэзыдыумы гарадзкіх саветаў на працягу месяца з дню апавяшчэньня пастановы.

Увага * Сьпісы асоб, вызваленых камісіяй ад плацяжоў з адзнакай аб зьнятай суме, павінны быць вывешаны ў страхавых агэнцтвах для ведама насельніцтва.

§ 21. Ільготы па гарадзкім страхаваньні павінны быць дадзены насельніцтву не пазьней 1-га лістапада 1929 году,

Ад ЦКК КП(б)Б.

У панядзелак, 5-га жніўня, а 6 з пал. гадз. увечары адбудзецца пасяджэньне Парттройкі ЦКК КП(б)Б (Менск, Савецкая 55 3-ці паверх, пакой № 18), дзе будуць разглядацца справы наступных таварышоў:

Тав. Вержбіцкага Матвея Грыгораьіча—Аршанскай арганізацыі, т. Сапежанскага Базыля Базылявіча—Магілеўскай арган., тав. Харкаўскага Алеся Сьцяпанавіча—Калапеніцкага райёну, т. Камлача Макоіма Міхасева—Менскай арганізацыі, т. Салоўскага Іосіфа Абрамавіча Менск. арг., т. Ліўшыца Мордуха Тэвелева Менскай арг., т. Арабей Мікалая Лявонавіча Менск. арг., т. Гольдзіна Саламона Гіршавіча Менск. арг., т. Бабінчука-Рабіновіча Эмануіла Іванавіча Менск. арг., т. Гнедзько Міхася Гардзеевіча Менск. арг,, т. Зусмановіча Ізраіля Майсеева Менск. арг.

Паказаныя вышэй т. т. павінны зьявіцца на вызначаны час.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Бел. ЛЯЎКОЎ.

За лепшае ўкамплектаваньне школ

Вынікі прыёму мінулага году ў 4-хгадовыя школы і сямёхгодкі паказалі, што органы Наркамасьветы на мясцох, а таксама і школы не зьвярнулі дастатковай увагі на большае ўцягненьне ў школы дзяцей рабочых, калгасьнікаў, батракоў і беднаты.

Вакол гэтага пытаньня ня была завострана ўвага шырокай савецкай грамадзкасьці.

З прычыны гэтага склад дзяцей у школах вышэйпаказаных катэгорый асабліва ў II канцэнтры сямёхгадовых школ, быў нездавальняючы. Аб гэтым сьведчаць наступныя лічбы прыёму ў У групы па БССР: дзяцей рабочых—12,81 проц. усяго ліку залічаных, дзяцей батракоў—1,24 проц. і дзяцей вясковай беднаты (вызваленых ад с.-г. падатку)—12,93 проц.

Характэрнымі зьяўляюцца лічбы прынятых дзяцей батракоў і вясковай беднаты.

Калі ўзяць лічбу сялян вызваленых ад с.-г. падатку, якіх мы лічым беднатой, то іх налічваецца па БССР 35 проц., а дзяцей беднаты, прынятых у У-ю групу сямёхгадовых школ—12,93 проц. агульнага ліку залічаных.

Сямёхгадовыя школы зьяўляюцца подступамі да тэхнікумаў і вышэйшых навучальных устаноў, якія ўжо падрыхтоўваюць спэцыялістаў па розных галінах гаспадаркі і культуры, подступамі да аўладаньня камандным вышынямі, і ад таго, хто будзе ўладаць гэтымі камандным вышынямі, залежыць у значнай меры справа замацаваньня дыктатуры пралетарыяту.

Вось чаму мы ня можам супакоіцца на лічбах прыёму мінулага году.

Сямёхгодкі павінны быць запоўнены ў першую чаргу дзяцьмі рабочых і блізкіх да пралетарыяту сацыяльных груповак.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што да пачатку новага навучальнага году безадкладна патрэбна зварушыць усю савецкую грамадзкасьць за самы большы ахоп школамі дзяцей рабочых, калгасьнікаў, батракоў і беднаты. Разам з гэтым неабходна павесьці агітацыю за большае ўцягненьне ў школы дзяўчынак, якіх налічваецца ў 4-хгадовых школах 35,3 проц., а ў школах узвышанага тыпу—41,8 проц.

Школы павінны ўступіць у сацыялістычнае спаборніцтва за лепшае ўкамплектаваньне па сацыяльнаму стану. Неабходна зараз-жа праз мясцовы друк і насьценныя газэты інфармаваць працоўныя масы аб часе і правілах прыёму ў школы, распачаць агітацыю за своечасовы пачатак навучальнага году.

Патрэбна, каб сямёхгадовая школа і 4-хгодка ў горадзе і мястэчку пачала працаваць з 25 жніўня, а 4-хгадовыя школы на вёсцы—не пазьней 15 верасьня.

Неабходна арганізаваць у клюбах, пардамох, хатах-чытальнях, чырвоных куткох і бібліятэках справачную работу па пытаньнях прыёму ў школы і гутаркі за своечасовую пасылку дзяцей у школы.

Пытаньне аб пасылцы дзяцей у школу паставіць на пленумах РВК, гарадзкіх, местачковых і сельскіх саветаў, на сходах прафсаюзаў, у сходах, калгасах, на сходах вясковай і местачковай беднаты. Праз сэкцыі парасьветы гарадзкога і местачковага саветаў і культкамісій сальскіх саветаў павесьці належную працу за большае ўцягненьне ў школы дзяцей рабочых, калгасьнікаў, батракоў і беднаты.

Праз камсамольскія, піанэрскія і вучнёўскія арганізацыі неабходна наладзіць культнаходы вучняў на прадпрыёмствы, у саўгасы, калгасы і на вёску з тэй-жа мэтай. Да вярбоўкі ў школы дзяцей пералічаных вышэй сацыяльных груп патрэбна прыцягнуць жаночы актыў.

Хто лепш укамплектуе школу?—Вось задача, якую павінна паставіць школа ў парадак сёньнешняга дню.

М. Жыгмунт.

Чаму павышаны стаўкі за памол збожжа

Значна зьніжаны валавы збор хлебных культур па Саюзу ССР у 1928-29 сельска-гаспадарчым годзе супроць 27-28 г. і напружанае ў сувязі з гэтым становішча ў першым-жа месяцы на рынку хлебазагатовак выклікала неабходнасьць адшукаць меры да недапушчэньня перабояў у абслугоўваньні хлебам працоўнага насельніцтва, асабліва бядняцкіх і незаможных серадняцкіх гаспадарак вёскі.

Апроч уведзенай строгай эканоміі выдаткаваньня хлеба ў гарадох, быў устаноўлен парадак узіманьня на млынох за перамол зярна замест грошай натуральны збор (зярном), які прызначаўся выключна для здавальненьня патрэб бядняцкай і незаможнай серадняцкай часткі вёскі.

Да 1928 году былі ўстаноўлены памольныя стаўкі за перапрацоўку сялянскага зярна грашмі, аднак млынары ўсяляк стараліся браць з сялян за памол зярна не грашыма, а натурай, на што ў шмат якіх выпадках налягалі самі-ж сяляне, якія ня маюць часам у наліччы грошай для расплаты за памол; гэта давала млынарам магчымасьць накапляць вялікія партыі хлеба.

Гэтыя абставіны давалі млынаром магчымасьць пасьля прадаваць гэты хлеб па ўзвышаных цэнах, гэтаму-ж бядняцкаму і серадняцкаму сельскаму насельніцтву, ад якога гэты хлеб быў імі сабраны ў выглядзе памольнага збору.

Урад, улічваючы вышэйпаказаныя абставіны і маючы на мэце пазбавіць магчымасьці спэкулянтаў і кулацтва нажывацца за кошт працоўных, а з другога боку—для забясьпечаньня сельскага бядняцкага і незаможнага серадняцкага насельніцтва хлебам па цьвёрда ўстаноўленых цэнах—пастанавіў увесьці абавязковае ўзіманьне памольнай платы за перапрацоўку сялянскага зярна выключна натурай (зярном) з абавязковай здачай млынамі ўсяго паступіўшага памольнага збору мясцовай спажывецкай каапэрацыі па дзяржаўных цьвёрдых цэнах. Сабраны памольны збор быў выдаткаваны выключна на здавальненьне патрэб бядняцкага і незаможнага серадняцкага вясковага насельніцтва па тых-жа цьвёрдых цэнах.

Усяго было сабрана ў 1928-29 годзе памольнага збору 410.300 цэнтн., ці 2.502.830 пуд., які быў поўнасьцю разьмяркован паміж сельскім насельніцтвам. Аднак, гэтая колькасьць зьявілася недастатковай для здавальненьня поўнай патрэбы, і некаторая частка бядняцкага насельніцтва была прымушана набываць хлеб дадаткова ў прыватных гандляроў і кулакоў па высокіх цэнах.

Улічваючы неабходнасьць большага забясьпечаньня беднаты і незаможнага серадняцтва хлебам і вызваленьня яго ад залежнасьці кулакоў і спэкулянтаў, а таксама ўлічваючы тое, што вялікая маса зярна пераапрацоўваецца заможнай часткай вёскі,—урад БССР пастанавіў павысіць з 1-УII—29 г. памольныя натуральныя стаўкі за памол сялянскага зярна, што павялічыць фонд для большага забясьпечаньня сельскай беднаты хлебам.

Паколькі запасы хлеба сельскай беднаты, якія пераапрацоўваюцца імі на млынох, зьяўляюцца нязначнымі, і паколькі ім хлеб адпускаецца каапэрацыяй у пераапрацаваным выглядзе, гэтае мерапрыёмства на інтарэсах беднаты амаль што не адабяецца і, наадварот, больш забясьпечыць іх хлебам.

У мінулым годзе былі выпадкі злоўжываньняў з боку ўласьнікаў млыноў у сэнсе няправільнага ўзіманьня імі з сялян памольнага збору, схаваньня яго і няпоўнай здачы апошняга каапэрацыі, за што некаторыя млынары былі прыцягнуты да судовай адказнасьці і панесьлі адпаведнае пакаранье.

Дзеля недапушчэньня ў далейшым подобных злоўжываньняў, запрапанавана Саюзхлебу арганізаваць штат кантралёраў па кожнаму райёну, якія мелі-б сталы нагляд за млынапрадпрыёмцамі.

Акрамя нагляданьня кантралёраў за млынамі, павінен быць павышан грамадзкі кантроль, павінна быць узьнята актыўнасьць пайшчыкаў каапэрацыі і камітэтаў узаемадапамогі.

Беднота і маламоцнае серадняцтва павінны зразумець, што гэта мерапрыёмства накіравана выключна да ўзмацненьня іх гаспадарак.

Інспэктар Наркамгандлю САКАЛОЎ.

ХРОНІКА.

Парадак правядзеньня Чырвонага Дню.

Сёньня, 1-га жніўня, а 5-й гадзіне дню рабочыя буйных прадпрыёмстваў г. Менску пасьля працы прыходзяць на Пляц Волі. Рабочыя і служачыя дробных прадпрыёмстваў зьбіраюцца ў клюбах і на прадпрыёмствах, пасьля чаго наніроўваюцца калёнамі на Пляц Волі, дзе адбудзецца кароткі мітынг, прысьвечаны Міжнародаваму Чырвонаму Дню. Адбудзецца мітынг, на якім выступяць з прамовамі прадстаўнікі ЦК КП(б)Б, Менскага Аргкому, ЦВК, АВК і ЦСПСБ.

Старшыня ЦВК БССР т. Чарвякоў вярнуўся з водпуску.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР і СССР тав. Чарвякоў учора вярнуўся з водпуску і прыступіў да выкананьня сваіх абавязкаў.

Чырвонаармейцы на Асінбудзе.

21-22 ліпеня г. г. адбылася вялікая экскурсія чырвонаармейцаў ад усіх часьцей лягеру „Чырвонае Урочышча" на Асінбуд.

Пасьля двухдзеннага, пільнага агляду кожнага куточка Асінбуду, экскурсанты сумесна з рабочымі і служачымі наладзілі мытынг, на якім галоўны інжынэр Асінбуду тав. **Алейнікаў** зрабіў даклад аб ходзе працы на станцыі. З прывітаньнем адзіным экскурсантаў выступіў паліткіраўнік №-скага артпалка тав. **Левін**, які ўпэніў, што Чырвоная армія здольна абараніць мірнае сацыялістычнае будаўніцтва ад нападу на яго імпэрыялізму. Віталі працоўных Асінбуду і чырвонармейцы, якія заяўлялі аб сваёй гатоўнасьці бараніць дзяржаву. Сход паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б), ураду БССР і Рэваенсавету СССР.

Працаўнікі мастацтва—на індустрыялізацыю краіны.

Працаўнікі мастацтва г. Менску на сваіх агульных сходах адзінагалосна пастанавілі 5 жніўня (дзень адпачынку) працаваць. Прыбытні ад пастановак, а таксама заработная плата за гэты дзень поўнасьцю будзе перададзена ў фонд індустрыялізацыі краіны.

На сваім агульна-гарадзкім сходзе працаўнікі мастацтва пастанавілі на працягу 5-ці год працаваць штогод адзін дзень на карысьць індустрыялізацыі краіны.

100.000 руб.—у фонд індустрыялізацыі.

Паводле вестак ВСНГБел. ад адработкі дню індустрыялізацыі па фабрыках і заводах рэспубліканскай прамысловасьці павінна паступіць у фонд індустрыялізацыі каля 100.000 руб.

Сельска-гаспадарчыя машыны—вёсцы.

На вёнешні дзень у Белсельсаюзе ёсьць для высылкі ў райёны 147 сенакасілак, 120 конных грабель, 347 жнярак-самаскідалак, 16 снапавязалак, 14 малатарнаў да трактараў, 7.337 веялак, 1085 сарціровак і 486 трэераў.

Вайсковы паход саюзу друкароў.

Па ініцыятыве партыйнай ячэйкі Белдзяржвыдавецтва і мясцкомаў сэкцыі працаўнікоў друку 3 жніўня будзе наладжан вайсковы паход у лягерь падшэфнай вайсковай часьці.

Масавая экскурсія рабочых.

Саюз харчавікоў 4 жніўня наладжвае масавую экскурсію членаў саюзу—рабочых менскіх прадпрыёмстваў харчовай прамысловасьці. Экскурсія будзе праведзена разам з падшэфнай вайсковай часьцю ў Весялоўку. Экскурсія ставіць мэтай папулярызацыю фізкультуры і вайсковай прапаганды.

Пабудова новых рабочых сталовак.

На цагляным заводзе № 1 „Белдзяржстрою" ў наступным годзе будзе пабудавана рабочая сталоўка. На заводзе № 2 будзе будавацца рабочая сталоўка і клюб.

Грамадзкі кантроль над будаўніцтвам.

Камунальная сэкцыя Менскага гарсавету вылучыла камісію ў складзе 25 чалавек для назіраньня і кантролю заходам будаўніцтва трамваю. Такую-ж камісію сэкцыя вылучыла для кантролю за ходам будаўніцтва каналізацыі.

Новая абанемэнтная сыстэма ў кіно „Культура".

Культаддзел ЦСПСБ распрацаваў праект новай абанемэнтнай сыстэмы ў кіно „Культура". Будуць выпушчаны невялічкія кніжкі, якія будуць сапраўдны ў працягу 4-х месяцаў. За гэты пэрыяд уласьнік абанемэнту зможа паглядзець 17-18 розных кіно-карцін.

Абанемэнтная кніжка будзе каштаваць 1 руб., пры прад'яўленьні яе рабочы будзе карыстацца скідкай з білету 25 пр. Для ўласьнікаў абанемэнтаў будзе арганізоўвацца ў кіно спэцыяльная каса, якая будзе працаваць у час абедзеннага перапынку і ўвечары.

Новыя правілы прыёму ў вячэрнія рабфакі.

У мінулым гады для паступленьня на вячэрні рабфак рабочаму трэба было мець камандыроўку ад свайго прафсаюзу. Саюзы атрымоўвалі пэўную колькасьць месц на рабфакі і часта іх поўнасьцю не скарыстоўвалі.

ЦСПСБ пастанавіў сёлета зрабіць прыём у вячэрнія рабфакі толькі па заявах паступаючых. Заявы павінны накіроўвацца ў свой фабзавмясцком, які дае заключэньне і праз адпаведнае ЦП саюзу накіроўвае яе ў прыймовую камісію рабфаку.

ЦП саюзаў і фабзавмясцкомы павінны правесьці шырокую растлумачальную кампанію на прадпрыемствах аб новых правілах прыёму і зьвярнуць увагу на вярбоўку ў рабфакі больш падыходзячых кандыдатаў. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на ўцягненьне работнік на рабфакі.

Справачнік экскурсанта.

Менская Інспэкцыя Народнай Асьветы выдае зборнік-справачнік экскурсанта па гораду Менску. Зборнік будзе выдадзен з тыражом у некалькі тысяч экзэмпляраў.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 1-га ЖНІЎНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.84	—
Бяспроц. выйгр паз. 26 г.	127.50	129.50
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.70	101.10
10 проц. выйгр. пазыка 1927 г.	26.15	26.15
3-я сялянск. выйгр. паз. 1927 г.	5.00	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.60	10.65
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.76	25.86
2 „ „ „ проц.	26.54,5	26.64,5
„ „ „ „ 6-проц.	25.46.5	25.56,5
II проц. дзярж. паз. 28 г.	104.58	104,63
12 проц. рэтная пазыка 1927 г.	102	—

Апавяшчэньні.

АД МЕНСКАЙ КАМІСІІ ПА ЎПАРАДКАВАНЬНІ НА СЛУЖБУ ДЭМАБІЛІЗАВАНАГА НАЧАЛЬНІЦКАГА СКЛАДУ.

У зьвязку з невыкананьнем некаторымі ўстановамі і прадпрыёмствамі гор. Менску і Менскай акругі распараджэньняў Урадаў СССР і БССР аб замяшчэньні 3 проц. пасад дэмабілізаванымі з начскладу РСЧА, камісія зьвяртаецца да кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў:

1) паведаміць у тыднёвы тэрмін аб тых установах і прадпрыёмствах, дзе 3 проц. брони яшчэ не замешчана дэмабілізаванымі з начскладу, альбо пасады броні засталіся вакантнымі з уходам дэмабілізаваных;

2) не праводзіць звальненьня дэмабілізаваных, якія пасланы на работу камісі